Камуністычная партыя (бальшэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 191 (5024)
жніўня
28
АЎТОРАК
1934 г.
год выдання XVIII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

УСЕСАЮЗНЫ ПУШКІНСКІ КАМІТЭТ

МАСКВА, 27 жніўня. (БЕЛТА).

У сувязі са спаўняючымся ў 1937 г. стагоддзем з дня смерці вялікага рускага паэта, творца рускай літаратурнай мовы і роднаначальніка новай рускай літаратуры А. С. ПУШКІНА —прэзідыум ЦВК Саюза ССР пастанавіў арганізаваць усесаюзны Пушкінскі камітэт пад старшынствам АЛЕКСЕЯ МАКСІМАВІЧА ГОРКАГА. У склад камітэта ўвайшлі тт. ВАРАШЫЛАЎ К. Е., КУЙБЫШЭЎ В. В., КІРАЎ С. М., ЖДАНАЎ А. А., ЕНУКІДЗЕ А. С., СТЭЦКІ А. І. БУБНОЎ А. С., ЗАТОНСКІ В. П. і рад другіх членаў урада, акадэмікаў, работнікаў літаратуры, выдатных пісьменнікаў, паэтаў і артыстаў Саюза і нацыянальных рэспублік.

Пушкінскаму камітэту даручана выпрацаваць мерапрыемствы па увекавечанню памяці вялікага паэта і садзейнічаць шырокай папулярызацыі яго творчасці сярод працоўных Совецкага Саюза. Распрацаваныя камітэтам прапановы павінны быць унесены на зацвярджэнне ЦВК Саюза ССР.

АБ САМАКРЫТЫЦЫ

Матэрыял «У Лепелі не любяць самакрытыкі», які мы сёння друкуем, далёка выходзіць за рамкі Лепеля. Ён мае ПРЫНЦЫПОВАЕ значэнне. Факты гавораць аб тым, што з самакрытыкай у нас небяспечна ў РАДЗЕ раёнаў. Возьмем хоць-бы факты, прыведзеныя ў «Звяздзе» за апошнія два-тры месяцы. Па сігналу аднаго парторга «Звязды» дае матэрыял аб засмечанасці калгасаў МСЦІСЛАЎШЧЫНЫ кулацкімі элементамі.

Здавалася-б, што павінна было арабіць раённае кіраўніцтва? Яно павінна было падняць на ногі парторганізацыю, паставіць абмеркаванне матэрыялаў у кожнай партгрупе, у кожным калгасе, мабілізуючы гэтым рэвалюцыйную пільнасць усёй калгаснай масы. Што-ж зрабіў Мсціслаўскі РК? Матэрыялы «Звязды» не толькі не перадрукоўваюцца ў раённым друку, не толькі не абмяркоўваюцца ў парторганізацыі, але РК, у асобе яго ранейшага сакратара ТАРАСАВА, устае на шлях «сочиненительства»—паведамляе ў ЦК і «Звязду», што кіраўніцтва калгаса аздароўлена, у той час, калі кулацкія падрыўшчыкі развальваюць калгас да сярэдзіны чэрвеня. Ці можна дзівіцца таму, што раён, дзе кіраўніцтва зажымала самакрытыку, плёўся ў хвасце і ніяк не можа дагэтуль выйсці з прарыву?

Або возьмем другі раён — ТАЛАЧЫНСКІ. На аснове пісем калгаснікаў з раду калгасаў і сельсоветаў Талачынскага раёна і карэспандэнцыі спецкора, пасланага для расследвання гэтых пісем, «Звязда» ўскрыла адсутнасць рэвалюцыйнай пільнасці ў раёне, засмечанасць кулацкімі элементамі раду калгасаў і сельсоветаў, наяўнасць раду кулацкіх адвакатаў у раённых апаратах, нават у самім РК (кіраўнік справамі). І што-ж? Можа райком скарыстаў матэрыялы «Звязды» для разгортвання самакрытыкі, мабілізацыі партарганізацыі на ўзмацненне рэвалюцыйнай пільнасці калгаснікаў? Зусім не. Райком проста адмоўчваўся (раённая газета не перадрукавала матэрыялаў «Звязды»). Патрабаваўся адкрыты запрос «Звязды», патрабавалася ТРЭЦЯЕ не выступленне, якое ўскрыла, што Талачынскі РК баіцца самакрытыкі, баіцца разгарнуць самакрытыку, не зважаючы на асобы, каб РК, але ўжо пры новым кіраўніцтве, зрабіў (пакуль у рэзалюцыі) неабходныя палітычныя вывады.

Ці можна зноў-жа дзівіцца таму, што Талачын не выходзіць з прарыву?

Услед за Мсціславам і Талачыном мы маглі-б указаць на ГОРАЦКІ РК, які хацеў адмоўчвацца, калі была ўскрыта па раду сельсоветаў практыка насаджэння прышчэпаўскіх хутароў; на МОЗЫРСКІ РК, які дагэтуль адмоўчваецца перад тварам выяўленых у раёне фактаў «лявацкіх» перагібаў у мясазагатоўках.

Можна сабе ўявіць, як адносяцца гэтыя раёны да самакрытыкі, калі ЦО КП(б)Б трэба некалькі раз выступаць АДКРЫТА, каб прымусіць гэтыя райкомы загаварыць. Можна сабе ўявіць, якімі павінны быць адносіны ГЭТЫХ РК да крытыкі, якая ідзе знізу, ад РАДАВЫХ членаў партыі або партактыва раёна!

Але да чаго вядзе гэта баязнь самакрытыкі? Даволі ўспомніць аб чым ішла гутарка ў матэрыялах па ГЭТЫХ раёнах, каб зразумець, што ГЭТА БАЯЗНЬ САМАКРЫТЫКІ ВЯДЗЕ ДА ПРЫТУПЛЕННЯ РЭВОЛЮЦЫЙНАЙ ПІЛЬНАСЦІ, ДА АСЛАБЛЕННЯ БАРАЦЬБЫ З КУЛАЦКІМІ ЭЛЕМЕНТАМІ, да аслаблення барацьбы з «лявацкімі» перагібамі, з практыкай насаджэння прышчэпаўскіх хутароў па таму або іншаму ўказанаму раёну.

Іменна гэта баязнь самакрытыкі з'яўляецца адной з галоўных прычын таго, што, напрыклад, ГАРАДОЦКІ, ПОЛАЦКІ, ДУБРОВЕНСКІ і СУРАЖСКІ раёны плятуцца ў хвасце сельска-гаспадарчых кампаній. Гэтыя раёны ўсё лета (а Гарадок, Сураж, Дуброўна рад гадоў) цягнуць уніз усю рэспубліку. А ў кіраўніцтве гэтых раёнаў пануе нейкі незразумелы спакой, быццам усё ў парадку.

Гэта баязнь самакрытыкі да дабра прывесці не можа. Гэта з дастаткова вядомай вязнасцю ўскрыта ў апошнім рашэнні ЦК ВКП(б) аб становішчы ў пензенскай партарганізацыі.

Пералічаныя намі раёны, якія ганебна плятуцца ў хвасце, павінны зразумець, што толькі па-большэвіцку разгортваючы самакрытыку яны змогуць падняць боездольнасць сваіх партарганізацый, узмацніць рэвалюцыйную пільнасць мас. Яны павінны зразумець, што адной з рашаючых прадпасылак ліквідацыі адставання БССР, выхаду рэспублікі на перадавыя пазіцыі соцыялістычнай будоўлі ўсяго СССР, было тое, што новае кіраўніцтва ЦК КП(б)Б на чале з тав. ГІКАЛО па-большэвіцку разгарнула крытыку і самакрытыку недахопаў, якія меліся; па-большэвіцку праводзіла ў жыццё ўказанні ЦК ВКП(б); з большэвіцкай смеласцю кожны раз ускрывала прычыны тых або іншых затрудненняў, мабілізуючы КП(б)Б, усіх рабочых і калгаснікаў БССР на перамаганне гэтых труднасцей.

Кіраўніцтва гэтых раёнаў павінна вучыцца ў т. Гікало таму, як большэвікі павінны разгортваць самакрытыку. Трэба зразумець, што самакрытыка з'яўлялася і з'яўляецца ленінскім, сталінскім метадам штодзённай работы партыі. Той, хто гэтага не хоча зразумець, той не можа стаяць ля руля кіраўніцтва, незалежна ад таго, ці ідзе гутарка аб рэспубліканскай арганізацыі, ці аб раёне, сельсавеце, калгасе.

ПЕРАМОГА БОЛЬШЭВІКОЎ МЕНСКА

Учора ў «Звязадзе» быў апублікаван рапарт Менскага горсовета і гаркома партыі аб выкананні гадавога плана хлебапаставак, натураплаты, звароту насеннай і харчовай пазыкі.

Менскі раён ніколі не ведаў яшчэ такіх ранніх тэрмінаў выканання планаў хлебапаставак. Гэты факт мае агромаднае палітычнае і гаспадарчае значэнне. Ён сведчыць аб тым, што менская партарганізацыя пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б займае ганаровае авангардное месца ў КП(б)Б у барацьбе за выкананне гаспадарча - палітычных задач.

Галоўнай і рашаючай умовай гэтай перамогі з'явілася тое, што менская партыйная арганізацыя дабілася сур'ёзных поспехаў у рэалізацыі рашэнняў XVII з'езда ВКП(б) і XV з'езда КП(б)Б. Перабудоўваючы сваю работу ў адпаведнасці з гістарычнымі рашэннямі з'ездаў, яна здолела ўсёй сумай арганізацыйна-масавых выхаваўчых мерапрыемстваў ахапіць партыйныя і беспартыйныя масы.

Паспяхова і паральна ў ранні тэрмін закончыўшы веснавую сяўбу і пераключыўшыся на прапоўку, партарганізацыя і калгасы ў той-жа час вялі ўзмоцненую падрыхтоўку да ўборкі і хлебаздачы.

Былі расстаўлены партыйныя сілы на ўсіх ўчастках. Гарком партыі і палітаддзелы апаратыўна, шляхам выездаў на месцы, склікання нарад, арганізацыі розных курсаў і т. д., падрыхтоўваліся да таго, каб у тэрмін і добраякасна ўбраць ураджай і выканаць абавязацельствы перад дзяржавай.

Можна было-б пералічыць не адзін дзесятак каштоўнейшых мерапрыемстваў, праведзеных гаркомам партыі і палітаддзеламі па гэтых пытаннях. Злёты брыгадзіраў, жанчын, рабсель кораў, курсы рэдактароў насценных калгасных і брыгадных газет, злёты па ахове ўраджаю, нарады інспектароў па якасці і т. д. і т. д.—вось далёка не поўны пералік гэтых мерапрыемстваў.

СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА СТАЛА АСНОЎНЫМ МЕТАДАМ У РАБОЦЕ. У калгасе «Першае мая» спаборнічаючыя брыгады ФІЛІПОВІЧ і ХМЯЛЕЎСКАЙ перавыконвалі норму па жніву. Ударнікі-калгаснікі КАМЛЮК, ШАЙКОЎСКАЯ выжыналі па 0,17 і 0,18 гектара ў дзень.

На абмалоце машыніст МЯДВЕДСКІ і брыгадзір ПАЛОНСКІ на поўскладанай малатарні ў 10 гадзін змалочвалі па 800 пудоў зярна.

На палях уборкі была рашуча па стаўлена барацьба са стратамі. Зернаўпавіцелі, збор капасоў—усё гэта давала дадатковыя тоны зярна. А ў калгасе «Першае мая» 24 піонеры штодзённа выходзілі на збор капасоў і сабралі звыш 6 цэнтнераў зярна. Такім чынам сабранае, высушанае і змалочанае зярно накіроўвалася на пункты хлебаздачы.

Барацьба за раннія тэрміны і за высокую якасць была асноўным і рашаючым позугнам у спаборніцтве брыгад, звенняў, калгасаў і сельсветаў.

Поспех Менска пішні раз падкрэслівае, што пры правільнай пастаноўцы партыйнага кіраўніцтва ўсімі звеннямі кожны калгас, сельсавет, раён мае усе ўмовы для паспяховага і датэрміновага выканання планаў.

Не рэкардсменствам, не парадняй шуміхай, а дзелавой штодзённай работай у брыгадзе, звяне вырашаецца поспех.

Зараз партарганізацыя пераключыла свае сілы на асеннюю сяўбу, на падрыхтоўку да ўборкі бульбы, на паспяховае завяршэнне ўсіх работ гэтага года.

Задача заключаецца ў тым, каб, не супакойваючыся на дасягнутых поспехах, змагаючыся з усякага роду момантамі «галавакружэння ад поспехаў», пераключыць усе сілы на завяршэнне ўсіх сельска-гаспадарчых работ. Для гэтага ёсць усе умовы.

Па прыкладу Менска ўсе партыйныя арганізацыі павінны ўзмацніць сваю работу па завяршэнню хлебапаставак у бліжэйшыя дні.

Для гэтага трэба яшчэ больш разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва з тым, каб выраўняць увесь фронт, г. зн. падцягнуць адстаючых да ўзроўню перадавых.

ЦК КП(б)Б—тав. ГІКАЛО НАРКОМАСВЕТЫ—тав. ЧАРНУШЭВІЧУ

Канферэнцыя настаўнікаў Клімаўшчыны шле палкае большэвіцкае прывітанне. Мы, настаўнікі, запэўняем Вас, што новы навучальны год пачнем падрыхтавана і своечасова будзем змагацца за школу Маркса-Леніна-Сталіна. Поўнасцю ажыццявім пастанову ЦК і СНК аб школе.

ПРЭЗІДЫУМ.

Сёння ў 6 г. 30 мінут увечары ў Доме партактыва адбудзецца

агульна-гарадскі партыйны актыў

з парадкам дня: Дакпад аб XX МЮД'е.

Пропускі на актыў атрымаць у ГК КП(б)Б, пакой № 39.

Сакратар ГК КП(б)Б РЫСКІН.

РАШАЮЧЫЯ УЧАСТКІ ХЛЕБАЗДАЧЫ—АДНААСОБНЫ СЕКТАР І ВЫКАНАННЕ ПЛАНА НАТУРАПЛАТЫ

Ход хлебапаставак па БССР

На 25 жніўня (у процантах)

Калгасы	91,9 проц.
Калгасы МТС	89,3 „
Аднаасобнікі	63,9 „
Соўгасы	67,9 „
Натураплата МТС	45,9 „
Зварот насеннай пазыкі	32,2 „
Разам па БССР	71,9 проц.

У АВАНГАРДЗЕ ХЛЕБАПАСТАВАК

ГЛУСК. (ПА ТЕЛЕГРАФУ).

Калгасы Глускай МТС на 25 жніўня выканалі гадавы план абавязковых хлебапаставак.

ДЫРЭКТАР МТС КАЗЛОЎ.
Начальнік палітаддзела МТС КРАЎЧАНКА.
УПОЎКАМЗАГ ШЫБКО.

ЦЕРАХОЎКА. (ПА ТЭЛЕГРАФУ).

Скончыўшы 21 жніўня здачу абавязковых хлебапаставак, калгасы ЦЕРАХАЎСКАЙ МТС 26-га жніўня выканалі гадавы план натураплаты.

ДЫРЭКТАР МТС АНАНЬЕЎ
НАЧПАЛІТАДДЗЕЛА КЕЧКІН
УПАЎКАМЗАГ ШТЭЙНГОЛЬЦ.

ЖЛОБІН. (ПА ТЭЛЕФОНУ).

Калгасы зоны дзейнасці ЖЛОБІНСКАЙ МТС на 25 жніўня выканалі план абавязковых хлебапаставак дзяржаве і натураплаты.

Дырэктар МТС ЖУРОК.
Нач. палітаддзела БРЫГНЕВІЧ.
Упаўкамзаг АНОДЗІН.

СМАЛЯВІЧЫ. (Па тэлеграфу).

Смалявіцкі раён на 26 жніўня выканаў гадавы план хлебапаставак па калгасна-сялянскаму сектару на 64 дні раней мінулага года. За час хлебапаставак у калгасы ўступіла 20 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Прадаўжаем барацьбу за завяршэнне хлебапаставак па соўгасах і натураплаце.

Сакратар РК КП(б)Б КУДМАН.
Старшыня РВК ХАДАРКЕВІЧ.
Райупаўкамзаг ТАРАСЕВІЧ.

Соўгасы сістэмы Белсадгародтрэста гадавы план хлебаздачы дзяржаве на 25 жніўня выканалі поўнасцю.

Дырэктар трэста САМОХІН.

ЗРЫУШЧЫКІ ХЛЕБАПАСТАВАК

РАЁН	Проц. выканання галоўнага плана	Здана алія-хоб нікамі	Здана натур заплаты
Гарадоцкі	45,6	26,9	29,2
Дуброўенскі	45,7	31,9	12,0
Суражскі	45,9	44,1	14,4
Шклоўскі	47,1	34,8	14,5
Мсціслаўскі	47,5	29,8	10,3
Дрысенскі	50,8	40,3	30,5
Расонскі	50,8	40,8	30,8
Лельчыцкі	53,7	46,2	47,4
Талачынскі	55,4	37,4	23,3
Петрыкоўскі	55,5	42,5	30,4

ЗЛАЧЫННА ЗАЦЯГВАЮЦЬ СЯЎБУ АЗІМЫХ

(З ПІСЕМ У РЭДАКЦЫЮ)

Селькор Р. Карапёў з Клімавіцкага раёна піша:

«Калгасы Пуцімельскага сельсавета яшчэ не пачыналі падрыхтоўкі да сяўбы. Калгас «Большэвік» (старшыня Карасёў П.) падрыхтаваў да пасеву толькі 6 гектараў. Калгасы «Чырвоная паляна» і «Перамога» зусім не прыступілі да ворыва.

У калгасах гэтага сельсавета не вылучаны брыгады па правядзенню сяўбы. Тут сяўбу адкладаюць на позную восень».

«Калгасы Барысаўшчыны, — піша селькор Паўлавец, — пачалі сяўбу ва ўстаноўлены тэрмін. Але ў радзе месц тэмпы яе зусім неадвальняючыя. У соўгасе Сержпутова за 5 дзён пасеяна толькі 7 гектараў. Трактарная сеялка працуе з перабоямі з-за тэхнічнай няспраўнасці».

КАЛГАСЫ АРШАНСКАЙ МТС ВЫКАНАЛІ ПЛАН АЗІМАЙ СЯЎБЫ

ОРША, 27 ЖНІЎНЯ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ).

УСТАНОЎЛЕНЫ ЎРАДАМ ПЛАН АЗІМАЙ СЯЎБЫ Ў КОЛЬКАСЦІ 4.400 ГЕКТАРАЎ КАЛГАСЫ АРШАНСКАЙ МТС ДА 27 ЖНІЎНЯ ВЫКАНАЛІ НА 100 ПРОЦ. ПРАДАЎЖАЕМ СЯЎБУ ЗВЫШ ПЛАНА.

ДЫРЭКТАР МТС СЕБЕСЕВІЧ.
НАЧ. ПАЛІТАДДЗЕЛА РАЗУМАЎ.

Сяўбу азімых адкладаюць на верасень

ЧЫРВОНАПОЛЛЕ. (Ад карэспандэнта «Звязды»).

У мінулым годзе ў раёне сеялі азімыя вельмі позна. Цяжка знайсці такі калгас, які-б правёў сяўбу летась, хоць-бы ў канцы жніўня. Дрэнныя папярэднікі і не апрацаваная зямля, якая ў большасці была няўгноеная, дала нізкі ўраджай.

Здавалася-б, гэта павінна было паслужыць урокам для гэтага года. Нічога падобнага. Замест таго, каб правесці сяўбу азімых у жніўні, адкладаюць яе на верасень. З 15 па 20 жніўня па раёну засеяна калгасамі толькі 57 гектараў і аднаасобнікамі 2 гектары. Наступная пяцідзеўка не дае вялікіх зрухаў у сяўбе. У большасці калгасаў нават не праведзена падрыхтоўка глебы, не вылучаны спецыяльныя звенні з брыгад, якія-б праводзілі і адказвалі за скончанне сяўбы ў тэрмін.

Старшыня калгаса «Каса», Міхніцкага сельсавета, Шагаў аб правядзенні сяўбы нават яшчэ і не думае і ніякай падрыхтоўкі да яе не праводзіць.

— Справімся з уборкай, а там будзем бачыць.

Можна сабе ўявіць, як гэты калгас справіцца з уборкай, калі яшчэ зараз на полі знаходзіцца 66 гектараў грэчкі, з якіх 12 не скошана, а астатняя прарастае ў пракосах. Таксама ляжыць і прарастае 14 гектараў ячменю, 22 гектары аўса (15 яшчэ не скошана) і 14 гектараў невыцераблена-га ільну. Такія настроі і становішча ў радзе другіх калгасаў.

З 13500 гектараў азімых 3902 гектары будзе засеяна па добрых папярэдніках (пашар, паліна, вікавішча), а астатнія будуць сеяцца па ячменішчы, пшанічышчы і часткай па бульбовішчы. За выключэннем 2-3 калгасаў усюды на зернавых яравых сяўба будзе праходзіць пры аднаразовым узворванні. Вядома, што сяўба ў аднаразор дрэнна адбіваецца на ўраджайнасці. Аднак, райза не даў ніякіх указанняў калгасам, каб загадзя, як толькі былі зняты яравыя, хоць-бы на той, плошчы, дзе будуць сеяцца азімыя правесці дробнае лушчэнне і перад сяўбой другі раз узараць глыбей.

М. ВІШНЕЎСКІ.

ЗАЯВА ЯПОНСКАГА МІНІСТЭРСТВА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ АБ ХОДЗЕ ПЕРАГАВОРАЎ АБ КУЧ

ТОКІО, 21 жніўня. (БЕЛТА). Сёння ўвечары апублікавана прастранная заява міністэрства замежных спраў аб ходзе перагавораў аб КУЧ, якія адбываліся ў Токіо пры пасярэдніцтве Хірота. Заява ўказвае, што, «японскі ўрад усё яшчэ спадзяецца на падыходзячае і здавальняючае ўрэгуляванне пытання аб КУЧ». Заява гаворыць:

«У пачатку перагавораў паміж СССР і Манчжоу-Го аб перадачы КУЧ, якія пачаліся 26 чэрвеня пры пасярэдніцтве японскага ўрада, совецкі прадстаўнік прапанаваў 250 мільёнаў залатых рублёў, ці калі 625 млн. іен (па так званаму афіцыяльнаму курсу совецкага ўрада) ў якасці цаны КУЧ, настойваючы, апрача таго, аб уплаце Манчжоу-Го ўсёй сумы выходных дапамог совецкім служачым дарогі. Манчжурск! прадстаўнік прадставіў контрпрапанову, якая заключаецца ў тым, што цана павінна быць вызначана ў 50 млн. іен, улічваючы сапраўдны ход чыгуначнага будаўніцтва ў Манчжоу-Го, а таксама факт, што КУЧ знаходзіцца пад сумесным кіраўніцтвам СССР і Манчжоу-Го. Пазней совецкая дэлегацыя прапанавала знізіць першапачатковую лічбу на 50 млн. залатых рублёў. Перагаворы, якія тармазіліся бясконцымі абстрактнымі аргументамі, зацягнуліся да кастрычніка, калі прыпыніліся ў сувязі з совецкай прапагандай, абвінавачваўшай Японію і Манчжоу-Го ў змове з мэтай захвацць КУЧ сілаю. Аднак, у лютым 1934 года перагаворы аднавіліся. Совецкі прадстаўнік прадставіў Хірота новую лічбу ў 200 млн. іен папяровай валюты ў якасці цаны КУЧ і ў адказ на японскае запытанне заявіў, што СССР будзе таксама прасіць дадатковую суму каля 30 млн. іен выходных дапамог совецкім служачым КУЧ.

Хірота таксама быў уручан баланс актыва і пасіва дарогі на 1-е студзеня. У адпаведнасці з гэтым на прамежкавай канферэнцыі ад 26-га красавіка манчжурскі прадстаўнік, жадаючы дружалюбнага завяршэння перагавораў, прапанаваў павысіць пакупную цану з 50 млн. да 100 млн. іен пры ўмове, што Манчжоу-Го атрымлівае ўвесь актыў дарогі і прымае адказнасць за пасіў, паказаны ў вышэйпамянёным балансе, а СССР павінен заплаціць выходную дапамогу совецкім служачым, паколькі нармальна, каб СССР, як прадавец, заплаціў выходную дапамогу. Аднак, совецкі прадстаўнік адказаў толькі 25 мая ўказаннем, што СССР згодзен зменшыць цану на 10 млн. іен. Перагаворы зноў аказаліся пад пагрозай тупіка. У гэтым становішчы Хірота прадставіў совецкаму паслу пробны план завяршэння перагавораў на базе ўстанаўлення цаны КУЧ у 100 млн. іен з выплатай выходных дапамог Манчжоу-Го. У адказ на гэты план совецкі прадстаўнік зноў прапанаваў знізіць цану КУЧ на 20 млн. іен—да 170 млн. іен, што аставіла ўсё яшчэ глыбокае разыходжанне паміж лічбамі СССР і Манчжоу-Го, арабіўшы безнадзейным давядзенне перагавораў да паспяховага завяршэння.

23-га ліпеня Хірота звярнуўся да совецкага пасла з прапановай, якая праследвала мэту прыяцельскага вырашэння праблемы з шырокага пункту гледжання прыязных адносін паміж СССР, Японіяй і Манчжоу-Го і якую Хірота, як пасярэднік, лічыў справядлівай і правільнаю. Хірота прапанаваў устанавіць цану на КУЧ у 120 млн. іен і Манчжоу-Го прыняло на сябе абавязацельства па выплаце выходных дапамог совецкім служачым. Адначасова Хірота паведаміў совецкаму паслу погляды манчжурскага ўрада на іншыя прынцыповыя пытанні, звязаныя з перадачай КУЧ.

30-га ліпеня совецкі ўрад, адхіліўшы вышэйўказаны пасярэдніцкі план Хірота, уручыў контр-план, у якім цана была зніжана толькі на новыя 10 млн. іен да 160 млн. іен (з улажэннем на Манчжоу-Го ўплаты выходных дапамог совецкім служачым). Далей контр-план змяшчаў новыя ўмовы перадачы КУЧ, уключаючы так званую «залатую клаўзулу», якая адносіцца да плацяжоў грашыма, а таксама прапанову ў сувязі з плацяжамі таварамі, якая гаворыць, што кошт тавараў павінен быць вызначан пры завяршэнні перагавораў аб перадачы.

Хірота прабаваў пераканаць совецкі ўрад перагледзець яго план. Аднак, план зноў быў адхілен СССР 10-га жніўня, у сувязі з чым Хірота параіў, каб СССР і Манчжоу-Го прабавалі вырашыць пытанне шляхам непасрэдных перагавораў.

13-га жніўня манчжурскі дэлегат Охасі наведаў совецкага пасла. Як паведамляюць, ён указаў паслу, што манчжурскі ўрад, улічваючы шчырасць, праяўленую Хірота пры яго намаганнях дабіцца прыязнага вырашэння пытання, гатоў прыняць пасярэдніцкі план і заявіў, што совецкі ўрад зрабіў-бы добра, прыняўшы гэты самы план. Пасол, аднак указаў, што калі ад Манчжоу-Го не паследуе прапановы аб больш высокай цане, то СССР не намерэн уступіць у непасрэдныя перагаворы. Охасі настойна прасіў аб далейшым дэтальным размышленні з совецкага боку і паведаміў пасла, што ў дзнай абстаноўцы яго прабыванне ў Токіо бескарысна, о таму ён выязджае, хоць яго ад'езд ніякім чынам не можа лічыцца аднаклаю манчжурскага намеру сарваць перагаворы. У адпаведнасці з гэтым Охасі паехаў, аднак, галоўны дэлегат Ці Шы-юань усё яшчэ знаходзіцца ў Токіо.

Як відаць з вышэйпрыведзенага агляду перагавораў, японскі ўрад быў увесь час, як пасярэднік, шчырым і не астаўляў нічога ў рупных стараннях дабіцца паспяховага вырашэння пытання. Не гледзячы на гэта яўнае жаданне японскага ўрада, совецкі ўрад нядаўна прышоў к заключэнню лічыць прапанову Хірота, як нешта накшталт ультыматума і, больш таго, пашырае прапаганду, якая пацвярджае наяўнасць нейкай сувязі паміж арыштамі, праведзенымі ў сувязі з шкодаю, часткова прычыняемай паездам на Усходняй лініі КУЧ і перагаворамі аб перадачы дарогі.

Тое, што японскае міністэрства замежных спраў з'яўляецца толькі пасярэднікам і, як такі, не здолен уручыць ультыматум, было ім асобна растлумачана совецкаму дэлегату. У адпаведнасці з гэтым, пасля совецкага адхілення вышэйпамянёнага плана, Хірота не пайшоў далей і рэкамендаваў непасрэдныя перагаворы паміж СССР і Манчжоу-Го. З другога боку, ясна, што арышты, праведзеныя ў сувязі з пашкоджаннямі, прычыненымі паездам, з'яўляюцца проста судовымі справамі, якія адносяцца да змоў пускаць пад адкос ваенныя паезды, што часта мела месца з ранняй вясны 1934 года, а таксама не маюць ніякага дачынення да перагавораў аб перадачы КУЧ. Апрача таго, хоць совецкі бок сцвярджае, што ён пайшоў на вялікія ўступкі, цэны, прапанаваныя СССР у першых стадыях перагавораў, а іменна 250 млн. залатых рублёў (625 млн. іен), 200 млн. руб. (500 млн. іен), у параўнанні з лічбамі, назначанымі пазней з лютага 1934 года, акажуцца ні чым іншым, як прызнаннем, што першапачатковыя цэны былі аснованы на грубым перавялічэнні. З самага пачатку перагавораў меліся розныя заўвагі аб сапраўдных намерах совецкага ўрада ў сувязі з совецкаю прапановаю аб перадачы КУЧ. Гаварылася, напрыклад, што хоць СССР выказвае жаданні весці перагаворы мірна, гэта прадстаўляе толькі сімуляцыю і на самой справе СССР прабуе зацягнуць перагаворы ў надзеі ўбачыць Японію ўцягнутай у міжнародны «крызіс», які па меркаванню СССР, з'яўляецца неміну чым. Вось чаму, калі нават адбудзецца пагадненне аб цане КУЧ, перагаворы маглі-б быць зацягнуты бясконца, па крайняй меры да наступаючай зімы, калі-б СССР прапашуў зацягнуць дыскусію па другіх пунктах умоў перадачы дарогі.

Гаварылася, што калі на самой справе такавы сапраўдныя намеры СССР, то ўсе труды японскага ўрада ў справе пасярэдніцтва, незалежна ад таго, наколькі яны шчыры і нястомны, павінны немінуча аказацца бясплоднымі, і становішча тады было-б сапраўды вельмі цяжкім. Не гледзячы на існаванне падобнага роду заўваг, японскі ўрад пакладаўся на добрасумленнасць совецкага ўрада ў прапанове дапамагаць міру на Далёкім Усходзе, і японскаму ўраду ўдалося на крайняй меры дапамагчы давядзенню перагавораў да вышэйпамянёнага этапа пры дапамозе шчырых стараняў прыблізіць адны да другіх погляды зацікаўленых партнераў у неспакойных абставінах. Ці закончацца сучасныя перагаворы сумна, як прадказана некаторымі наглядальнікамі, відаць будзе толькі ў рэзультаце далейшага ходу падзей.

Японскі ўрад усё яшчэ мае надзею на падыходзячае здавальняючае ўрэгуляванне данай справы, а манчжурскі ўрад праявіў гатоўнасць прыняць на сябе велізарнае абавязацельства ў адносінах СССР у агульнай суме 150 млн. іен, дэманструючы гэтым дзеяннем манчжурскую волю дабіцца фундаментальнага вырашэння пытання аб КУЧ пры дапамозе мірных перагавораў. Істотная мэта даных перагавораў заключаецца ва ўстраненні прычын магчымых трэнняў з перадачай дарогі дапамагчы мірнаму развіццю адносін паміж СССР, Японіяй і Манчжоу-Го. Перагаворы, аднак, ніколі не завяршацца поспехам, калі будуць адкладвацца і адтэрміноўвацца пад прадлогам спрэчак, якія ўзнікаюць час-ад-часу на месцы.

Калі совецкі ўрад сапраўды хоча перадаць чыгунку і хоча перадаць яе максімальна хутка, то ён, несумненна, павінен даць належны доказ такога намеру.

ЗАЯВА МАНЧЖУРСКАГА МІНІСТЭРСТВА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ ПА ПОВАДУ ПЕРАГАВОРАЎ АБ КУЧ

ТОКІО, 23 жніўня (БЕЛТА). Агенцтва «Сімбун рэнга» паведамляе з Чанчуня, што манчжурскае міністэрства замежных спраў апублікавала 22-га жніўня наступную афіцыяльную заяву па поводу перагавораў аб КУЧ.

«У парушэнне пагадненняў, дасягнутага паміж дэлегатамі СССР, Японіі і Манчжоу-Го, совецкі ўрад 18-га жніўня апублікаваў праз ТАСС агляд ходу перагавораў. Згодна паведамлення ТАСС атрымліваецца, што толькі совецкі ўрад зрабіў велізарныя ўступкі. Мы не бачым, каб совецкі ўрад праяўляў шчырасць тым, што на працягу перагавораў вельмі рэзка знізіў запрошаную цану з 625 млн. іен да 200 млн. іен, бо запрошаныя ў пачатку 625 млн. іен або 250 млн. залатых рублёў з'яўляліся проста недарэчнай лічбай. Перагаворы маглі ўступіць у практычную фазу толькі тады, калі совецкі ўрад прапанаваў 200 млн. іен, у той час, як Манчжоу-Го прапанавала 50 млн. іен. Манчжурская лічба з'яўляецца разумнай, калі ўлічыць такія факты, што дарога будзе вернута Манчжоу-Го праз 30 год бясплатна, што яна мае патрэбу ў вялікім рамонце, а таксама тое, што неабходна правесці новае будаўніцтва на працяжэнні 1700 клм. У дадатак сама дарога з'яўляецца сумеснай маемасцю СССР і Манчжоу-Го. Пры гэтым неабходна адзначыць таксама, што совецкі ўрад не раз аб'яўляў аб сваім поўным адмаўленні ад дарогі, якая, згодна ўказання совецкага ўрада, набыта ў часе існавання царскага імперыялістычнага рэжыма. Манчжурскі ўрад спачатку нават адмаўляўся ад перагавораў па поводу перадачы КУЧ. Аднак, дзеля падтрымання міру на Далёкім Усходзе, а таксама з прычыны добрых услуг, прапанаваных японскім міністрам замежных спраў Хірота, Манчжоу-Го выказала гатоўнасць прыняць такаваную кампрамісную прапанову Хірота, якая ў канчатковым выніку, уключаючы выходныя дапамогі совецкім служачым КУЧ у памерах 30 млн. іен і 20 млн. іен манчжурскім служачым, складала 170 млн. іен. Вось чаму на справе Манчжоу-Го прапанавала 170 млн. іен супроць 200 млн. іен, першапачаткова запрошаных совецкім урадам.

Што датычыць мерапрыемстваў манчжурскага ўрада, прывёўшых к арышту некаторых совецкіх служачых КУЧ, то праўда заключаецца ў тым, што арыштаваныя прымалі ўдзел у нядаўнай змове, якая дабівалася крушэння ваенных паездоў у супрацоўніцтве з бандытамі. Падобныя меры з'яўляюцца нічым іншым, як самазабаронай і не маюць ніякага дачынення да перагавораў аб перадачы КУЧ. Наадварот, да паводзін СССР, якія выражаюцца ў несправядлівым уязванні нядаўніх арыштаў совецкіх служачых КУЧ з перагаворамі аб перадачы дарогі, трэба аднесціся з падазрэннем, маючы на ўвазе намеры, якія яны праследуюць».

ПАВЕДАМЛЕННЕ ТАСС

У сувязі з апублікаваннем заявы японскага міністэрства замежных спраў ад 21-га жніўня і заявы манчжурскага ўрада ад 22 жніўня па поводу перагавораў аб КУЧ ТАСС ушаўнаважан паведаміць наступнае:

Апублікаваныя заявы японска-манчжурскага боку паўтараюць у дакладнасці лічбы, названыя ТАСС у паведамленні ад 18-га жніўня.

Гэтыя лічбы і факты, аднак, асвятляюцца абодвума заявамі вельмі суб'ектыўна і аднабакова ў спробе даказаць, што ўступчывасць у перагаворах была праяўлена японска-манчжурскім бокам. У якасці прыкладу можна ўказаць на маючую месца ў заяве манчжурскага ўрада спробу пераканаць грамадскую думку, што японска-манчжурскі бок прапанаваў, за КУЧ не 120, а 170 млн. іен. Гэта апошняя лічба атрымліваецца шляхам уключэння ў яе 50 млн. іен выходных дапамог, якія павінны быць выплачаны совецкім і манчжурскім служачым дарогі ў выпадку іх звальнення. Тым часам зусім ясна, што звальненне або незвальненне служачых дарогі пасля яе куплі з'яўляецца справаю новага ўласніка дарогі — японска-манчжурскага боку, які павінен, натуральна, несці і звязаныя са звальненнем расходы на выходныя дапамогі. Пры гэтым зразумела, што падобныя расходы ніякім чынам не могуць увахо дзіць у склад цаны за КУЧ.

Надуманасць і штучнасць усіх аргументаў абодвух заяў, маючых на мэце апраўдаць вылучэнне адпаўховай думкі японска-манчжурскага боку, вызваляе ТАСС ад неабходнасці з імі палемізаваць.

АБ ЗАВОЧНЫМ ПАРТНАВУЧАННІ

ПАСТАНОВА БЮРО ЦК КП(б)Б

Бюро ЦК КП(б)Б адзначае, што гледзячы па некаторы зрух у разгортванні завочнай партвучобы ў 1933-34 г. становішча попрэжняе ўсё-ж з'яўляецца незадавальняючым, галоўным чынам з-за недастатковай увагі да гэтай справы з боку РК КП(б)Б.

Для сапраўднага масавага разгортвання завочнай партвучобы сярод раённага, партыйна-комсамольскага, прафесіянальнага і калгаснага актыва Бюро ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Устанавіць кантынгент новага набору завочнікаў на 1934-35 навучальны год у 2.000 чал. з іх 1000 чал. на 6-месячныя курсы калгаснага актыва, 300 чал. — ВНШ і 700 чал. — ЗКУ) і арганізаваных радыёслухачоў 4000 чал.

2. У мэтах найлепшага абслугоўвання завочнікаў набор вытвараць толькі ў 27 раёнах, якія павінны стаць апорнымі для завочнай партвучобы: 1) Менскім, 2) Віцебскім, 3) Гомельскім, 4) Хойніцкім, 5) Тураўскім, 6) Жыткавіцкім, 7) Полацкім, 8) Рэчыцкім, 9) Клімавіцкім, 10) Магілеўскім, 11) Рагачоўскім, 12) Касцюковіцкім, 13) Мсціслаўскім, 14) Мазырскім, 15) Заслаўскім, 16) Дзяржынскім, 17) Быхаўскім, 18) Бярэзінскім, 19) Плешчаніцкім, 20) Слуцкім, 21) Капыльскім, 22) Бабруйскім, 23) Асіпавіцкім, 24) Лельчыцкім, 25) Бягомльскім, 26) Камарынскім, 27) Барысаўскім.

3. Адзначаючы лўна незадавальняючае становішча з скарыстоўваннем радыё для мэт партвучобы, у выніку чаго не скарыстоўваецца створаная багатая матэрыяльна-тэхнічная база (звыш 300 партрадыёаўдыторый), прапанаваць РК КП(б)Б і начпалітаддзелам прыняць усе меры да арганізацыі радыё-слухання лекцыі і дакладаў, перадаваемых БІМЗО.

4. Прапанаваць Белрадыёкамітэту (т. Аракелаву) недапускаць заняцця гадзін, вызеленых для перадачы радыёлекцый па партвучобе БІМЗО, і прыняць меры па рэгулярнай трансляцыі гэтых лекцый усімі радыёвузламі.

5. Зацвердзіць у штатах РК КП(б)Б апорных раёнаў інструктара па завочнай партыйнай вучобе, які ўтрымліваецца за рахунак ІМЗО ЦК ВКП(б) — БІМЗО ЦК КП(б)Б.

Прыраўняць інструктароў РК па завочнай партвучобе ў адносінах снабжэння да іншых інструктароў РК КП(б)Б.

Маючы на ўвазе складанасць работы па завочнай партвучобе забараніць РК КП(б)Б пераводзіць інструктароў па завочнай партвучобе на другую работу без узгаднення з ІМЗО пры ЦК КП(б)Б.

6. Папярэдзіць сакратароў РК і начпалітаддзелаў паказаных раёнаў, што яны нясуць адказнасць за разгортванне завочнай партвучобы ў іх раёнах.

7. У мэтах стварэння неабходных умоў для работы БІМЗО, прапанаваць Дзяржплану разглядзець пытанне аб будаўніцтве ў 1935 г. інтэрната і сталоўкі для вучэбных канферэнцый завочнікаў і павышэння для размяшчэння БІМЗО.

8. Для падрыхтоўкі кадра работнікаў сістэмы завочнай партвучобы—дазволіць БІМЗО арганізаваць 6-месячныя стала існуючыя курсы інструктароў.

9. Прапанаваць Наркамсобу выдзяліць з 1 верасня г. г. кантынгент забеспячэння для канферэнцыі завочнікаў і курсаў штомесячна на 100 чалавек.

10. Абавязаць цэнтральны («Звязда» і «Рабочий») і раённы друк сістэматычна асвятляць ход завочнай партвучобы.

У ЛЕПЕЛІ НЕ ЛЮБЯЦЬ САМАКРЫТЫКІ

З жніўня «ЗВЯЗДА» надрукавала пісьмо б. чырвонаармейца ЧУДЗЕСНІКАВА і карэспандэнцыю завайго спецкора, які расследваў факты, прыведзеныя гэтым пісьмо. Надрукаваныя матэрыялы ўскрылі гідную карціну цкавання комуністаў, бяздушных адносін да іх з боку раённага кіраўніцтва, здзекавання з боку сельсовета, міліцыі і т. д. Надрукаваныя матэрыялы ўскрывалі ізасмечанасць калгасных кадраў кулацкімі элементамі, абвінавачвалі ў бяздушных адносінах да комуністаў — былых чырвонаармейцаў — самога сакратара РК т. ХІЖАНКОВА. Надрукаваныя матэрыялы мелі тым большае значэнне для Лепеля, што Лепельскі РК, і ў прыватнасці яго сакратар т. Хіжанкоў, ужо аднойчы (у 1932 г.) атрымлівалі строгае спагнанне ад ЦК за прытупленне класавай пільнасці (справа Лепельскай МТМ), што ў ЛІПЕНІ ГЭТАГА ГОДА «Звязда» ускрыла незвычайную засмечанасць кадраў ЗАГАДЧЫКАЎ ферм — гэтых камандзіраў калгаснай жывёлагадоўлі.

Якую-ж пазіцыю заняў Лепельскі РК у сувязі з апублікаваннем матэрыялаў «У Лепельскім раёне цкуюць былых чырвонаармейцаў»? ЁН ПРЫНЯЎ ГНІЛУЮ, НЕБОЛЬШЭВІЦКУЮ РЭЗАЛЮЦЫЮ. У ёй — ні слова аб засмечанасці кіруючых калгасных кадраў кулацкімі элементамі, ні слова аб бяздушных адносінах сакратара РК да комуністаў — былых чырвонаармейцаў. Адзіная задача, якую паставіў сабе Лепельскі РК у сваёй рэзалюцыі — змазаць ПАЛІЧНЫ сэнс справы, абяліць «усіх і ўся». Карэспандэнцыя ў «Звязде» правільная, але Лепельскі РК, бачыце, «рашуча абвяргае абвінавачанне ў цкаванні т. Чудзеснікава і Камарова». Дзіўнае ўлўленне ў лепельскіх таварышоў аб цкаванні. Калі «беспадстаўны арышт» (як прызнае РК) комуністаў і трыманне іх пад арыштам; калі высяленне — бяссэнсае, бяздушнае — комуністаў у хлеў з калгаснага дома (а ў гэтым доме жывуць людзі, не маючыя адносін да калгаса) не ёсць цкаванне, то што-ж разумеюць тады пад цкаваннем лепельскія гора-кіраўнікі? Бяздушныя да комуністаў, былых кіраўнікоў, лепельскія кіраўнікі вельмі далікатны, калі гутарка ідзе аб дзяржымордах раённага і сельсоветскага маштаба. І гэта зразумела. Як-жа магло бюро Лепельскага РК строга пакараць старшыню сельсовета Хамісэнка, арыштаваўшага Камарова, асабіста адбіраўшага ў апошняга партбілет, як-жа магло бюро Лепельскага РК строга пакараць начальніка райміліцыі, які аддаваў загад аб арышце комуністаў — б. чырвонаармейцаў, трымаў іх без усякай падставы 6 дзён, не паведаміў аб гэтым арышце пракурора, калі ў БЮРО РК НЕ ХАПІЛА БОЛЬШЭВІЦКАЙ МУЖНАСЦІ АБГАВАРЫЦЬ ПЫТАННЕ АБ БЯЗДУШНЫХ ПАВОДЗІНАХ САМОГА САКРАТАРА РК, КАЛІ САМО РАЁННАЕ КІРАЎНІЦТВА ВЕДАЛА АБ ЦКАВАННІ ЧУДЗЕСНІКАВА І КАМАРОВА, ПАТУРАЛА ГЭТАМУ ЦКАВАННЮ І НЕ ПАЖАДАЛА ПАСЛЯ МАТЭРЫЯЛАЎ У «ЗВЯЗДЗЕ» РАЗГАРНУЦЬ БОЛЬШЭВІЦКУЮ САМАКРЫТЫКУ?

У рэзультаце старшыня сельсовета, які ПАВІНЕН БЫЦЬ СУДЗІМ І З ГАНЬБАЙ БЫЦЬ ЧАГНАЧ З ПАРТЫІ, атрымлівае толькі суровую вымову з папярэджаннем. У рэзультаце начальнік міліцыі, ЯКІ ПАВІНЕН БЫЦЬ НЕАДКЛАДНА ЗНЯТ З РАБОТЫ, які павінен адказваць за свае дзяржымордаўскія ўчынкі, аддзелаваецца суровай вымовай.

У Лепелі баяцца самакрытыкі, патураюць дзяржымордам, не хочуць змагацца за вычышчэнне калгасных кадраў ад кулацкіх элементаў. Ці можна пасля гэтага здзіўляцца таму, што Лепель увесь час ганебна пляцецца ў хвасце.

«Звязда» спадзяецца, што партколегія Камісіі Партыйнага Кантроля, якая занялася лепельскай справай, дасць належную ацэнку агідняцям ў Лепельскім раёне і паводзінам лепельскага кіраўніцтва.

З ПАСТАНОВЫ БЮРО ЛЕПЕЛЬСКАГА РК КП(б)Б АД 12 ЖНІЎНЯ 1934 ГОДА

АБ ВЫНІКАХ РАССЛЕДАВАННЯ КАРЭСПАНДЭНЦЫІ „ЗВЯЗДЫ" „У ЛЕПЕЛЬСКІМ РАЁНЕ ЦКУЮЦЬ БЫЛЫХ ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ"

Лепельскі райком КП(б)Б, разгледзеўшы выступленне «Звязды» пра 3-VIII 1934 г. аб цкаванні ў жыццёе былых чырвонаармейцаў, вынырнаў, што сапраўды: раённыя, партыйна-совецкія арганізацыі ў свой час не прынялі большэвіцкіх мер да ўмацавання чырвонаармейскіх калгасаў, не арганізавалі ўкамплектавання іх дэмабілізаванымі чырвонаармейцамі і не прадставілі калгасам прадугледжаных пастановай СНК СССР ільгот.

Асабліва вялікай палітычнай памылкай райком лічыць тое, што «не былі вывучаны прычыны выезду чырвонаармейцаў з калгаса. Уход трох чырвонаармейцаў з калгаса не паслужыў сігналам адзіным партыйна-совецкім арганізацыям да ўмацавання калгаса стварэння адпаведных умоў заставшымся ў калгасе імя Дзяржынскага чырвонаармейцам».

«Старшыня сельсовета тав. Хамінчанка», — гаворыцца далей у пастанове, замест штодзённай дапамогі т. т. Чудзеснікаву і Камарову, замест вывучэння сапраўдных прычын адставання калгаса, наадварот, лічыў ва ўсім вінаватымі Чудзеснікава і Камарова. Больш таго, Хамінчанка сам прыйшоў удзел у вобыску і арышце т. Камарова, які рабіўся інспектарам міліцыі.

Нячула і па-бюракратычнаму паставіліся да Чудзеснікава і Камарова раённыя работнікі т. т. Гаравік, Расказаў і Смірноў. Гэтыя дапусцілі без ніякіх падстаў арышт т. Чудзеснікава і Камарова і трыманне іх па 6 дзён пад вартай».

Бюро РК КП(б)Б пастанавіла:

«Карэспандэнцыя «Звязды», сігналізуючая аб грубейшых фактах парушэння рэволюцыйнай законнасці з боку раду работнікаў, недастатковай увазе (ці толькі недастатковай? — Рэд.) і дапамозе дэмабілізаваным чырвонаармейцам, з'яўляецца правільнай. Адначасова бюро рашуча абвяргае абвінавачанне і цкаванне т. т. Чудзеснікава і Камарова (?!—рэд.).

Старшыні сельсовета Хамінчанку за нячулыя і фармальныя адносіны да Чудзеснікава і за ўдзел у вобыску і арышце чырвонаармейца-комуніста Камарова заслугоўвае выключэнне з радоў партыі, але, прымаючы пад увагу малапісьменнасць і прызнанне сваіх памылак... — абвясціць яму суровую вымову.

Начальнік міліцыі тав. Гаравік, за грубае парушэнне рэволюцыйнай законнасці, што выразілася ў беспадстаўным арышце комуністаў т. т. Камарова і Чудзеснікава і трыманні іх на працягу 6 дзён пад вартай, без паведамлення аб гэтым пракурору, заслугоўвае суровага партыйнага пакарання. Аднак, улічваючы, што тав. Гаравік асудзіў і прызнаў свае памылкі — абвясціць яму суровую вымову.

Тав. Расказаву, які распараджаўся арыштаваць Чудзеснікава, паставіць на від.

Тав. Смірнову, які слепа аднёсся пры дачы дазволу на арышт Чудзеснікава — указаць, каб ён у далейшым больш рашуча змагаўся з парушальнікамі рэволюцыйнай законнасці.

Зборка санітарнага самалёта, які прыбыў у Менск.

НАДГОМЕЛЬСКАЙ ПРАКУРАТУРАЙ НЕ КАПАЕ

(АД ГОМЕЛЬСКАГА КАРЭСПАНДЭНТА «ЗВЯЗДЫ»)

Пасля апублікавання пастановы ЦК ВКП(б) «Аб мерах барацьбы з абважаннем, абмеваннем і перавышэннем законных цэн» у радзе гандлюючых арганізацый горада разгарнулася вялікая работа па праверцы работы магазінаў, ларкоў, сталовых з пункту гледжання ўказанняў ЦК ВКП(б). Запрацавала «лёгкая кавалерыя» комсамольскай арганізацыі Белгандля ЦРК раду прадпрыемстваў. У раённай газеце «Палеская праўда» змешчаны некалькі дзесяткаў заметак, карэспандэнцый рабкораў рэйдавых брыгад, выкрываючых абважальнікаў, злоднеяў, жулікаў у гандлёвых установах.

Зусім зразумела, што ўсе гэтыя матэрыялы накіраваны ў пракуратуру для прыцягнення да судовай адказнасці гэтых асоб. Але Гомельская пракуратура аказалася надзвычай «добрасардэчнай», «гуманнай». Матэрыялы, трапіўшыя да яе, залежваюцца дзесяткі дзён. Следства вядзецца надзвычай марудна, часта бязгуба, аналітычна. Пацвердзім гэта фактамі.

Работніца магазіна № 2 Белгандля Вапнярская сістэматычна абважвала спажыўцоў на 10-15 грамаў на кілограм хлеба. Школьнікаў, Іофе—работнікі ларка Учдора 703—замест кілограма хлеба важылі 800-900 грамаў. Замест 100 грамаў селядцоў выдавалі рабочым дарожнікам 60 грамаў.

Ляжаць яшчэ дзесяткі аналагічных спраў на работніка магазіна № 16 Белгандля Варанчук Марыю, матэрыялы «лёгкай кавалерыі» Белгандля аб жульніцтве работнікаў магазіна № 24, 6 і яшчэ рад падобных матэрыялаў. Некаторыя матэрыялы ляжаць нерухома ў пракуратуры больш паўмесяца. Над іншымі алітавалася пракурорская рука і накіравала іх у аператыўны сектар міліцыі для расследвання. А канца гэтым справам пакуль не відаць. Трэба з усёй сілай адзначыць, што следства па гэтых справах вядзецца якасна нізка. Следчыя не ўваходзяць глыбока ў гэтыя справы, а гэта прыводзіць да таго, што многія ашуканцы ўвільваюць ад пролетарскага суда.

Так, напрыклад, следчы Асіповіч вёў следства аб незаконных нацэнках у ЗРК «Пролетарый» і прышоў да вываду, што ЗРК не вінават. Справа спыняецца. Калі работнікі рэдакцыі раённай газеты апратэставалі гэты вывад, ён у другі раз узяўся за справу і знайшоў, што работнікі вінаваты. Гарпракурор т. Буракоў, спасылаючыся на беднасць, на соцыяльнае паходжанне, партыйнасць жулікаў, некаторыя справы затрымаў ад перадачы суду. Асабліва прыходзіцца адзіўляцца на своеасаблівыя паводзіны пракуратуры. Ні адзін кіраўнік гандлюючых арганізацый, дзе выяўляюцца гэтыя ашуканствы, не прыцягнут нават да следства па гэтых справах, што ідзе ў разрэз з дырэктывай ЦК ВКП(б).

ПАЛЯШЧУК.

ПІСЬМЫ рабочых і калгаснікаў

САКРАТАРУ ПАРТКОМА ЗАВОДА ІМЯ ВАРАШЫЛАВА ТАВ. ДЭЙЧУ

КАЛГАС ПАТРАБУЕ АЗДАРАЎЛЕННЯ

(Пісьмо рабочага).

У калгасе завода імя Варашылава не вядзецца ніякай масавай і палітвыхаваўчай работы сярод рабочых. Парторг лічога канкрэтнага не робіць. Старшыня рабкома вядзе разлагацельскую работу сярод рабочых, п'янствуе, робіць дэбошы.

Дырэкцыя калгаса, як былы дырэктар Маркевіч, так сама і сучасны т. Салес, прымяняе своеасаблівыя метады «масавай» работы—штрафаванне рабочых.

Так, беспадстаўна аштрафавалі рабочага Яцэвіча на 15 руб., Навіцкага — на 15 руб., Яўхнацеля на 25 руб., Умецкага на 25 руб. і іншых. У большасці штрафуюць за патраву птушкамі або іншай жывёлай.

Грамадскае харчаванне ў калгасе пастаўлена зусім дрэнна

ЖЫТЦО.

***

(АД СПЕЦЫЯЛЬНАГА КАРЭСПАНДЭНТА «ЗВЯЗДЫ»)

Факты, прыведзеныя ў пісьме тав. Жытцо, пры праверцы на месцы нашым карэспандэнтам, поўнасцю пацвердзіліся. Дырэктар соўгаса тав. Маркевіч па-шкодніцку адносіўся да гаспадаркі. Больш 2 га сталовых буракоў прапала, бо іх не прапалолі.

СТАРШЫНЯ РАБКОМА БАРКУН, ЧЛЕН ПАРТЫІ, СІСТЭМАТЫЧНА П'ЯНСТВУЕ. Ён нават не цікавіцца пытаннем папяпшэння грамадскага харчавання рабочых.

На працягу ўсяго часу сельскагаспадарчых работ сталоўка працуе зусім дрэнна. Меню нікопі не мяняецца—гатуюць адну капусту. У сталоўцы бруд, поўна мух. Столь працякае. Калі пройдзе дождж, у сталоўцы поўна вады.

Аб стварэнні кармовай базы ні дырэкцыя, ні грамадскія арганізацыі нават і не думаюць. Па плану калгас павінен засіласаваць 500 тон сілосу, а на сёняшні дзень да сілосавання яшчэ зусім не прыступілі.

Заўком завода імя Варашылава вычосіць шмат рэзалюцый аб дапамозе ў правядзенні культмасавай работы, але за ўвесь час ні аднаго культурнага мерапрыемства не праведзена. Тое-ж самае робіць і астатнія гаспадарчыя арганізацыі.

ВАЛЬФСОН.

САКРАТАРУ ЧЭРВЕНЬСКАГА РК КП(б)Б ТАВ. ВАСІЛЬЕВАЙ

ЗЛАЧЫНЦАЎ СУРОВА ПАКАРАЦЬ

У вёсцы Пагуляжка, Грабенскага сельсовета (Чэрвеньскі раён), на млыне пад выглядам рабочых сабраліся антысовецкія, контрэволюцыйныя элементы. Вось яны: Шайкоўскі Антон — бандыт, які вярнуўся з папраўчага лагера, Расолька Я. — кулак, уцёкшы з папраўчай калоніі, Блецька І. З. —кулак, ліпэнец, Знан А. — выключаны з калгаса за дэзарганізацыйную работу і інш. Узначальвае гэту хэўру млынар А. Гутнін.

За 9 месяцаў змянілася 7 загадчыкаў млына. Увесну гэтага года быў назначан загадчыкам Баранін. Качагарам млына астаўся працаваць Дзінерштэйн Ісак—калгас «Новы мір» дапусціў яго працаваць на млыне.

Шайка Гутніна, бачачы, што яго злачынный дзейнасці прыходзіць канец, пачала шалёнае цкаванне сумленных работнікаў Варонка і Дзінерштэйна. Гутнін адкрыта заявіў, што не дапусціць «жыцьцё» працаваць на млыне. Варонка пераводзяць на другі млын. Замест яго загадчыкам застаецца Дайняк, які зараз-жа папаў пад уплыў Гутніна. Без усякай прычыны Дайняк здымае з работы качагара Дзінерштэйна, а замест яго становіцца бандыт Шайкоўскі. Распараджэнне старшыні сельсовета аб аднаўленні на рабоце Дзінерштэйна Дайняк не выканаў.

Райгазета «Калектывіст», у якую мы пісалі аб гэтым, маўчыць.

ІВАНОВІЧ, КАПЛАН, ЗНАК, МАЛІНОЎСКІ.

У МАГІЛЕВЕ НЕ ВЫКОНВАЮЦЬ РАШЭННЯЎ ЦК АБ КІРАЎНІЦТВЕ АДНААСОБНІКАМІ

Яшчэ ў сакавіку бягучага году, у сувязі з тэлеграмай сакратара ЦК ВКП(б) т. Жданава аб падрыхтоўцы да сяўбы аднаасобнікаў у Гомельскім і Магілеўскім раёнах, Цэнтральны Камітэт КП(б)Б у спецыяльнай пастанове адзначыў, што адставанне аднаасобнага сектара ў Магілеўшчыне з'яўляецца рэзультатам «недаацэнкі партыйнымі і совецкімі арганізацыямі раёна аднаасобнікаў». Далей ЦК абавязаў РК і РВК «дабіцца ліквідацыі недаацэнкі з боку партыйнай і совецкай арганізацый раёна работы сярод аднаасобнікаў, рашуча прыцягваючы да адказнасці тых з работнікаў і арганізацый, якія гэту работу не праводзяць».

Факты і лічбы сведчаць аб тым, што ні райком партыі (сакратар т. РАВІНСКІ), ні РВК (старшыня т. ПУШЧЫН) не зрабілі належных вываадаў з рашэння ЦК і не забяспечылі яго выканання.

Праўда, за апошні час РК і РВК не раз у сваіх шматлікіх пастановах упамінаюць пра аднаасобніка. Але, калі ўдумацца ў сутнасць гэтых «упамінанняў», то стане ясна, што яны пра аднаасобніка робяцца «ў парадку службовых абавязкаў», фармальна. Падаю адзін з многіх прыкладаў.

Аднаасобнікі недапушчальна адстаюць у хлебапастаўках, раён заносіцца на чорную дошку, а райком партыі, замест таго, каб даць канкрэтныя ўказанні, разгорнуцца праграму работы нізавым партыйным звенням сярод аднаасобнікаў, абмежаваўся бюракратычнай адпіскай: «пераключыцца на арганізацыю дапамогі ва ўборцы і хлебасдачы аднаасобнікам і ўзяць на буксір адстаючых».

Адным словам—«пашырыць, паглыбіць і, нарэшце, пакласці рашучы канец».

Прычым, як правіла, і гэтыя пастановы не выконваліся, бо не было праверкі выканання.

У радзе сельсоветаў (Бракоўскі, Дашкоўскі, Бялявіцкі) аднаасобнікі не пачыналі хлебапаставак да 15 жніўня. А вось у вёсцы Агеўшчына (Мастоцкі сельсовет) аднаасобнікі рашылі здаваць хлеб толькі пасля... азімай сяўбы. Па некаторых сельсоветах (Бракоўскі) шырока распаўсюджана кулацкая практыка пакідання на пастаўках «хвастоў»:

Між тым ні раённыя работнікі, ні работнікі сельсветаў не лічаць патрэбным звяртаць увагу на падобныя «дробязі».

Ёсць факты, калі ў калгасах («Чырвоны Окцябр», Дасвіцкага сельсовета, «1 мая», Бракоўскага сельсовета, імя Молотава, Сталіна-Мастоцкага сельсовета і іншых) не выкарыстоўваюцца на 5-6 конных малатарнь, між тым аб групавой маладзьбе аднаасобнікаў ніхто из паклапаціўся.

Не менш яркія факты недаацэнкі аднаасобніка маюць месца і ў справе асенняй сяўбы. Замест таго каб мабілізаваць усю партарганізацыю на забеспячэнне своечасовага пачатку і добраякаснага правядзення аднаасобнікамі сяўбы, райком партыі па-ранейшаму прытрымліваецца сваіх улюбёных трафаретных і ў сваёй пастанове аб азімай сяўбе абмяжоўваецца тым, што прапануе сельсоветам... уцягваць аднаасобнікаў у калгасы і ні слова аб арганізацыйнай дапамозе аднаасобнікам, якія засяваюць 12.000 гектараў азімага кліну (40 проц. раённага плана).

І зноў атрымліваецца «шаўтарэнне пройдзенага». На 20 жніўня план сяўбы па раёну выканан на 7 проц., а аднаасобнікі засеялі толькі 3 проц. плана. Прычым у 26 сельсоветах ніхто не пачаў сеяць азімую пшаніцу. У тых сельсоветах, дзе аднаасобнікі займаюць яшчэ вялікую ўдзельную вагу (Княжыцы, Штэжары, Хонава, Гарадзішча, Бялявічы і інш.) азімая сяўба зусім не пачыналася.

А гэта не выпадкова: у гэтых сельсоветах да аднаасобнага сектара не даведзены планы сяўбы, шмат аднаасобнікаў не ведаюць дзе сеяць.

Зусім недапушчальна тое, што раённыя кіруючыя арганізацыі не ўзначальваюць цягі аднаасобнікаў у калгасы. Больш таго, нярэдкі выпадкі, калі калгасы адгароджваюцца ад аднаасобнікаў.

У Дабрасневіцкім сельсавеце рад аднаасобных гаспадарак, нават заможна-кулацкіх, сабатуюць з года ў год выкананне дзяржаўных абавязацельстваў, а між тым старшыня сельсовета Бялінскі і парторг Аранзон нават не ведаюць, як семнаццаць кулацкіх гаспадарак, сельсовета выканалі свае абавязацельствы, патураюць іх сабатажу.

У Магілеве няма большэвіцкай барацьбы за рэалізацыю дырэктыў ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б аб кіраўніцтве аднаасобнікамі. Іменна таму ў Магілеўскім раёне застой у калектывізацыі, іменна таму Магілеў адстае ў хлебапастаўках.

Віт. ДАЛЬ, Ів. УСХОДАЎ.

Па-дзелавому правесці падрыхтоўку да ўсебеларускага рабселькораўскага з'езда.

НЕ УХАПІЛІСЯ ЗА АСНОЎНАЕ ЗВЯНО

Агляд друку

„ЗА БОЛЬШЭВІЦКІЯ ТЭМПЫ"—газета Веткаўскага РК і РВК

Толькі пасля пленума ЦК КП(б)Б, падкрэсліўшага неабходнасць змагацца за кожны процант калектывізацыі, газета «За большэвіцкія тэмпы» ўспомніла, што гэта ўказанне перш за ўсё трэба ўлічыць Веткаўскаму раёну і персанальна ёй.

«У нас яшчэ 65 проц. аднаасобных гаспадарак. Наш раён па калектывізацыі з'яўляецца амаль самым адстаючым у БССР» — заявіла яна ў нумары ад 15 ліпеня.

Здавалася-б, перпачарговы абавязак газеты — прадумаць прычыны застою калектывізацыі ў Веткаўскім раёне, наглядна на канкрэтных прыкладах усвярыць іх перад партыйна-совецкім і калгасным актывам, каб мабілізаваць увагу на вузлавых пытаннях калектывізацыі, указаць асноўныя звенні, за якія трэба ўзяцца.

Але газета не ўмее аналізаваць з'явішчы, прадумваць пытанні (што з'яўляецца адным з асноўных абавязкаў газеты) і нават калі факты самі напіхторхоўваюць на вывады, яна не можа ўзняць пытання на прынцыповую вышыню. Маладыя ст.-закружскія калгаснікі толькі некалькі тыдняў уступіўшыя ў калгас, напісалі ў газету пісьмо:

«Мы, былыя аднаасобнікі пасёлка Свісток у часе ўборкі стелі калгаснікамі — паведамляілі яны. Адкрыта скажам — доўга хісталіся мы, пакуль такі рашылі ісці ў калгас... Зараз мы пічым ся бе калгаснікамі. Але па праўдзе скажам, што ў калгасе стаім не цвёрда. Старыя калгаснікі ўсімі мерамі стараюцца не дапусціць нас у калгас. Нам, напрыклад, сказалі: хочаце хадзіце на работу, хочаце не, усё роўна за працадзень вам не заплацім больш 30 капеек.

Мы бачым, што нам заўсёды, калі прыходзім, стараюцца даць горшую работу і ў апошнюю чаргу. Мы адчуваем сябе ў калгасе чужымі, па крайняй меры нам створана такая абстаноўка, што мы не адчуваем сябе роўнапраўнымі членамі калгаса...» (№ 96 ад 10-VIII).

Відаць, газета мела ўжо і раней падобныя сігналы, бо ў рэдакцыйных каментарыях к гэтаму пісьму яна спасылаецца таксама на калгас «Чырвоная моладзь», дзе, па яе словах, адсталая частка калгаснікаў заяўляе:

«Зячым нам прыйшоў? З работай мы спраўляемся і больш атрымліваем. А як напрымаем новеньких, так у нас павісіцца кошт працадня».

Як-жа рэагавала газета на гэтыя сур'ёзнейшыя сігналы? Яна кваліфікавала такія настроі, як кулацкія, і дала, так сказаць, фактычную спраўку аб парадку расплаты з калгаснікамі за зароблены імі працадзень.

Устае пытанне, хіба гэтыя факты не варты былі-б таго, каб супрацоўнікі газеты спецыяльна выехалі ў гэтыя калгасы, вывучылі абстаноўку, знайшлі карэнні зла, паказалі жывога ворага, што стаіць за гэтай справай, яго твар, яго тактыку, ударылі-б па ім так моцна, каб не было павадна другім і побач з гэтым растлумачылі-б калгаснікам, адурачаным ворагамі, што прыліў не толькі не вядзе да змяншэння даходнасці, але спрыяе павелічэнню яе. Але газета мала думае над пытаннямі сваёй работы, мала клапоціцца, каб адтачыць сваю зброю друкаванага слова. І таму важнейшыя факты не атрымліваюць у яе належнай завостранасці, матэрыялы носяць выпадковы раскіданы, нямэтанакіраны характар. То яна друкуе адозву да аднаасобнікаў злёта калгаснікаў (№ ад 4-VII), на якую не следуе ніякага адказу, то дае самаабавяза польства калгаснікаў-ударнікаў Давідаўскага сельсовета — завербаваць у калгасы не менш 100 гаспадарак аднаасобнікаў, каб больш не вярнуцца да гэтага пытання; то «у пошуках» дзелавой работы рэкамендуе аднаасобнікам: «Бярыце прыклад з Шкуратава». А ў чым-жа гэты прыклад? Аказваецца:

«Шкуратаў — чалавек разважлівы, добры гаспадар. Перш чым рашыцца на які-небудзь крок, Шкуратаў многа думае. У калгас Шкуратаў пашоў толькі тады, калі ўзважыў усё і калі пераканаўся ў выгоднасці гэтага мерапрыемства».

Ці не здаецца газеце «За большэвіцкія тэмпы», што аднаасобнікам Веткаўскага раёна, якія і так занадта доўга «ўзважваюць» пытанне, даўно ўжо ўзважанае партыяй і краінай, было-б карысней замест гэтага рэцэпта, які адначае па сутнасці — спачатку ўзваж усё, а потым ідзі паслухаць аб рабоце і жыцці тых, хто менш «думаў» і больш паспеў, хто рашуча ўступіўшы на шлях, указаны партыяй, ужо пераступіў з яе дапамогай парог заможнага жыцця.

На жаль, газета «За большэвіцкія тэмпы» забывае выкарыстаць гэту магутную зброю — зброю паказу заможнага жыцця калгасніка.

Праглядзеўшы нумары за рад месяцаў, мы не сустрэлі ні аднаго матэрыяла такога парадку.

Працоўны чакае ад газеты, каб яна яму давала кірунак жыцця. У даным выпадку абавязак газеты падштурхнуць аднаасобніка ў калгас, выкарыстаць усе наяўныя ў яе распараджэнні сродкі. Але для гэтага трэба, каб сама газета аўладала пытаннем, мела свой чоткі распрацаваны план.

ПА ПРЫКЛАДУ МЕНСКА СКОНЧЫЦЬ ХЛЕБАПАСТАЎКІ У ЖНІЎНІ

КАМЕНШТЭЙН

Нач. палітаддзела Большэвіцкай МТС

Што забяспечыла перамогу

На 40 дзён раней мінулага года ўгасы Большэвіцкай МТС Менскага раёна закончылі хлебапастаўкі. Прыблізна на 2 месяцы раней мінулага года мы выканалі план натураплаты МТС. Гэтыя поспехі з'яўляюцца яркім паказальнікам новых сацыялістычных адносін калгаснікаў да калгаснай працы, да калгаснай уласнасці.

Барацьба за большэвіцкія калгасы, за заможнае жыццё кожнага калгасніка стала асновай барацьбы ўсіх калгасаў і калгаснікаў за выкананне праводзімых намі ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній.

У аснову сваёй работы палітаддзел палажыў указанне партыі—дабіцца, каб не было ніводнага адстаючага калгаса. Уся ўвага была мабілізавана на тое, каб вывесці адстаючыя калгасы ў рады перадавых.

Асноўнай прычынай прарываў у многіх калгасах з'яўляецца дрэнная кіраўніцтва. Таму яшчэ ў часе падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі і да апошніх дзён мы звярнулі асаблівую ўвагу на падбор кіруючых кадраў у калгасах і брыгадах.

На аснове вывучэння і выхавання калгаснага актыва мы здолелі ў большасці прарыўных калгасаў вылучыць кіраўнікоў з саміх калгаснікаў. У калгасе імя Дзяржынскага мы на пасаду старшыні вылучылі радавога беспартыйнага калгасніка Савіцкага. Гэты таварыш пры дапамозе палітаддзела здолеў згуртаваць вакол сябе лепшых калгаснікаў. На пасаду брыгадзіраў былі вылучаны радавыя калгаснікі актывісты тт. Скуратовіч і Ліпень Франэк. У выніку работы актыва гэты калгас стаў непазнавальным. Сотні штрафаў былі накладзены ў мінулым годзе. А сёлета не быў аштрафован ні адзін калгаснік. Узмацнілася працоўная дысцыпліна, калгас вышаў у рады перадавых па нашай зоне.

Мы ўвесь час у сваёй рабоце імкнуліся падняць на належную вышыню ролю брыгадзіра, як камандзіра калгаснай вытворчасці. Брыгадзір Янкоўскі з калгаса «Камінтэрн» паказвае ўзоры высокага майстэрства кіраўніцтва брыгадай. Ён здолеў укараніць любоўныя адносіны да калгаснай маемасці, любоў да калгаснай працы сярод усіх калгаснікаў яго брыгады. Не было ніводнага выпадку спазнення на работу ў яго брыгадзе; ніводнага выпадку, каб конь, збрую або інвентар калгаснік кінуў абы дзе. А такіх брыгадзіраў, як Янкоўскі, мы маем ужо нямала ў гэтым годзе.

МТС у гэтым годзе больш тэхнічна ўзброена. Мы атрымалі большую колькасць трактароў і складаных малатарань. На падрыхтоўку кадраў, асабліва машыністаў малатарань, мы ў гэтым годзе звярнулі асаблівую ўвагу. І гэта дало свае вынікі. Большасць машыністаў перавыконваюць сваю норму малацьбы. Машыніст Мядведскі пры брыгадзіры Палонскім за 10 гадзін на поўскладзанай малатарні змалочвае больш 800 пудоў. Машыніст Жаркевіч на такой жа малатарні—каля 1000 пудоў. Непараўнальна з мінулым годам і якасць малацьбы. Часта ў кучы абмалочанай саломы не знойдзеш ніводнага зярна.

Пастановы пленума ЦК ВКП(б) і

КП(б)Б былі прапрацаваны ва ўсіх калгасных брыгадах. Сотні прапаноў уносілі калгаснікі аб тым, як лепш выканаць пастановы ЦК і прымяніць іх да ўмоў кожнага калгаса і кожнай брыгады. На барацьбу са стратамі былі мабілізаваны ўсе—ад малога да старога. У калгасе «Пяцігодка ў чатыры гады» (Новадворскі сельсавет), імя Молатава (Трасянецкі сельсавет), «Першае мая», (Кайкаўскі сельсавет) камісіі па якасці не знайшлі ніводнага непабранага коласа на іржышчы.

Высокі ўраджай, добра праведзеная ўборка павялічваюць вагу працадня ў большасці калгасаў нашай зоны. 4-6 кілограмаў збожжа на працадзень не будзе ўжо рэдкасцю ў многіх нашых перадавых калгасах.

Але дасягнутыя поспехі абавязваюць нас яшчэ з большай сілай змагацца за чарговыя задачы. Барацьба за высокі ўраджай будучага года з'яўляецца асновай нашай работы. Мы можам з упэўненасцю сказаць, што ні ў адным калгасе не астанецца ні кавалку гною, не вывезенага пад жыта. Сяўба не менш чым на 90 проц. будзе праведзена радковым насевам. Самая адказная задача, якая стаіць зараз перад намі—гэта забеспячэнне цёплай і сытай зімоўкі жывёле. Гэты ўчастак ўсё яшчэ ў нас з'яўляецца адстаючым.

Дасягнутыя поспехі ў барацьбе за высокі ўраджай ствараюць усе ўмовы для таго, каб стаячыя перад намі кампаніі выканаць на выдатна і тым забяспечыць за Менскім раёнам сцяг ЦК КП(б)Б і СНК БССР.

Змагацца за месца на ўсесаюзнай чырвонай дошцы

А. РЫСКІН

Сакратар менскага гаркома

Рэалізацыя ўказанняў правадыра партыі тав. Сталіна па пытаннях сельскай гаспадаркі патрабуе ўпартай, канкрэтнай барацьбы партыйных і совецкіх арганізацый на ўсіх участках работы. Справа арганізацыі і правядзення хлебапаставак з'яўляецца важнейшым гаспадарча-палітычным мерапрыемствам у агульнай суме работ па рэалізацыі гэтых указанняў. Таму на правядзенні хлебазагатовак мы сканцэнтравалі максімум увагі ўсіх партыйных і совецкіх арганізацый і калгаснага актыва раёна.

Для таго, каб хутка і добраякасна правесці хлебазагатоўкі, трэба было змагацца і забяспечыць правядзенне раду мерапрыемстваў, якія вызначаюць паспяховае правядзенне хлебапаставак. Сюды перш за ўсё адносіцца правядзенне ранняй добраякаснай сяўбы, спрыяючай раняму выспяванню культур і больш высокаму ўраджаю; своечасовае і поўнае правядзенне прапалачных работ і такая арганізацыя ўборкі і абмалоту, каб сабраць ураджай у максімальна кароткі тэрмін і без усякіх страт. А для гэтага патрабавалася не толькі не пакідаць ніводнай жняркі, малатарні і іншага ўборачнага інвентара невыкарыстанымі, але даць ім максімальную нагрузку, дабіўшыся поўнай эфектыўнасці іх работы, выкарыстоўваючы пры ўборцы і абмалоце ўсю без выключэння працаздольную (нават ледзь-ледзь працаздольную) рабочую сілу.

Гарком разам з палітаддзеламі разгарнуў вялікую палітычную і масава-растлумачальную работу сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў вакол правядзення гэтых асноўных работ, падмацаваўшы гэта радам арганізацыйных мерапрыемстваў. У дапамогу сельсоветам і калгасам быў послан рад кіруючых работнікаў гарадской арганізацыі, у сельсоветах, асабліва ў найбольш адстаючых пунктах арганізоўваліся выязныя пасяджэнні бюро гаркома і оргбюро РВК.

У справу арганізацыі хлебапаставак была ўцягнута ўся менская партыйная арганізацыя і, у першую чаргу, шэфствуючыя прадпрыемствы. Гэтыя мерапрыемствы забяспечылі паспяховае правядзенне хлебазагатоўчай кампаніі ў бягучым годзе.

Гадавы план загатовак фактычна быў выкананы за пяць пяцідзёнак — на 65 дзён раней мінулага года.

Надзвычай важным з'яўляецца той факт, што за датэрміновае і высокаякаснае выкананне хлебапаставак змагаліся актыўна шырокія масы калгаснікаў, выдзяляючы на адвозку хлеба дзяржаве, як ніколі, лепшых праверэных калгаснікаў-ударнікаў.

Адвозка хлеба дзяржаве ў радзе калгасаў з'яўлялася трыумфам са-

праўдных большэвіцкіх калгасаў. Весці і здаць добраякасны хлеб дзяржаве з'яўлялася справай гонару, за якую змагаліся лепшыя сілы калгасаў. Гэта можна было наглядаць у калгасах «Першая конная», імя Сталіна, Астрашыцка-Гарадзецкага сельсавета; імя Калініна, імя Войкава, «Ленінскі шлях» і іншых.

Большэвіцкія адносіны да справы выканання дзяржаўных абавязацельстваў, праяўленыя калгаснікамі і, асабліва, старшынямі ради калгасаў і сельсоветаў (тав. Ліштван, Якубовіч, Машок, Нагорскі, Гатоўшыц, Каліноўскі, Журок, Хападзінскі і рад іншых) павінны быць перанесены на ўсе калгасы нашага раёна.

Не менш важным з'яўляецца і тое, што ў гэту хлебазагатоўчую кампанію рад калгасаў, якія раней адставалі, выходзілі ў перадавыя рады барацьбітоў за выкананне сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай. Прыкладам можа служыць Каподзішчанскі сельсавет; калгасы «Ленінскі шлях», Самахвалавіцкага сельсавета; «Адраджэнне», «Звязда», Абчацкага сельсавета; «Новы шлях», А.-Гарадзецкага сельсавета і рад іншых.

Загатоўкі гэтага года, як ніколі, выявілі сапраўдны твар кожнага калгаса і яго кіраўнікоў, бо спрыяючыя ўмовы для загатовак гэтага года, велізарны рост палітычнай актыўнасці калгасных мас, найлепшы ўраджай у спалучэнні з выключна добрымі кліматычнымі ўмовамі выявілі базу і выкрывалі дарэшты кулацкія антыдзяржаўныя апартуністычныя элементы, рыхтаваўшыя затрымку і зрыў хлебазагатовак. Гэта можна было наглядаць у калгасе імя Сталіна, Прыгараднага сельсавета, «Аб'яднанне», Сенніцкага сельсавета; «Зара», А.-Гарадзецкага сельсавета; «Новы свет», Папернянскага сельсавета; «Пяцігодка ў чатыры гады», Грычанскага сельсавета.

Паспяховае выкананне хлебазагатовак па нашаму раёну было забяспечана дзякуючы значнаму ўзмацненню партыйна-масавай работы ў калгасах і сярод аднаасобнікаў, асабліва ў момант падрыхтоўчай работы. Шырокая прапрацоўка рашэнняў ліпеньскага пленума ЦК ВКП(б) і плюс да гэтага максімальная ўвага адстаючым участкам з'яўляліся спрыяльнем усёй масавай работы на вёсцы. Агромадную ролю ў гэтай справе адыгрываў наш друк — як цэнтральны, палітаддзельскі, так і пенасрэдна калгасны. Кожны нумар «Звязды», асабліва з апублікаваннем рашэнняў конкурснай камісіі, пры ўмелым яго выкарыстанні з'яўляўся велізарнейшым стымулам да новага ўздыму калгасных мас за датэрміновае выкананне плана. Калгасныя газеты, рашуча выкрываючыя лодыраў, рвачоў, злодасеў, з'яўляліся магутнымі арганізатарамі велізарнейшых людскіх рэзерваў у нашых калгасах. Паказальна работа ў гэтых адносінах партарга калгаса «Ленінскі шлях» тав. Патапава, парторга А.-Гарадзецкага сельсавета тав. Данілевіча і іншых.

Адначачоры поспехі хлебазагатовак, мы з усёй сур'ёзнасцю ўсведамляем і разумеем небяспеку супакаення і самахвальства, бо ўперадзе — велізарнейшая работа на завяршэнню астатніх важнейшых гаспадарча-палітычных мерапрыемстваў партыі. Асенняя сяўба, уборка і задача бульбы дзяржаве (тым больш, што намі пастаўлены задачы сабраць пад мяцёлку з калгасных двароў і ад калгаснікаў навоз і вывезці пад азімую сяўбу) патрабуюць ад нас яшчэ большага напружання сіл і энергіі ўсёй нашай партыйнай і совецка-грамадскіх арганізацый, беспартыйна-калгаснага актыва і перадавых аднаасобнікаў нашага раёна.

Паспяховым завяршэннем усіх астатніх сельска-гаспадарчых работ — асенняй сяўбы, уборкі бульбы, сілосавання, зяблева, — поўным завяршэннем астатніх відаў загатовак даб'ёмся месца на ўсесаюзнай чырвонай дошцы. Будзем змагацца за тое, каб БССР пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і тав. Гікало вышла ў лік перадавых рэспублік Совецкага Саюза.

Н. ПЛЯТНЁЎ

Нач. палітаддзела першай Менскай МТС

Галоўнае яшчэ непераадзе

Змагацца за ўборку ўраджаю так, каб ні адзін кілограм не астаўся на полі, на таку, не трапіў у рукі гультаю і злодзею; змагацца за тое, каб хутка і добра разлічыцца з дзяржавай—вось задача, а першых-жа дзён пастаўленая палітаддзелам перад усімі калгасамі, перад кожным брыгадзірам і калгаснікам паасобку.

Для таго, каб выканаць гэтыя за дачы, трэба было не раскідвацца, а

згрупаваць увагу на асноўных вузлавых пытаннях.

Не гаворачы аб праведзеных мерапрыемствах з партыйцамі комсамольцамі, старшынямі калгасаў і брыгадзірамі палітаддзел правёў спецыяльную работу з інспектарамі па якасці, з старыкамі вопытнікамі. Палітаддзел здолеў скарыстаць вопыт і аўтарытэт старыкоў-вопытнікаў — інспектароў па якасці. Інспектары па якасці ўнеслі рад каштоўных прапаноў па лепшай арганізацыі ўборкі без страт і хутчэйшай арганізацыі хлебазадачы.

Гэтыя прапановы, трэба сказаць, леглі ў аснову работы па барацьбе за сціслыя тэрміны і высокую якасць уборкі. Асобныя партарганізатары, у прыватнасці тав. Айзікаў (калгас імя Фалько) і іншыя разгарнулі работу з інспектарамі па якасці, з старыкамі. Адначасова была звернута ўвага на падрыхтоўку кадраў. Падрыхтаваны і перападрыхтаваны машыністы, якія павінны былі працаваць на жняркахсамаскідках, малатарнях. Падрыхтаваны таксама рэдактары і члены рэдкалегій брыгадных газет. Усяго прапушчаны праз курсы 300 чал.

У час уборкі на калгасных палях працавалі 34 трактары, 182 жняркі-самаскідкі, 15 снопавязалак, з іх 4 трактарных. Гэтыя трактары, жняркі і падрыхтаваныя кадры далі магчымасць ва ўстаноўленыя партыяй і ўрадам тэрміны без страт правесці ўборку.

Палітаддзелу ў сваёй рабоце прышлося зламаць сабатаж барацьбы са стратамі з боку асобных старшынь калгасаў. Мы мелі выпадак, калі старшыня калгаса «Чырвоны Пуцілавец»—член КП(б)В Барысюк, — не гледзячы на растлумачэнне палітаддзела, ігнараваў зернаўборачныя цэлі і збор каласоў.

Каб паказаць калгаснікам, што Барысюк на сустрэчу робіць кулацкую справу, палітаддзел устанавіў зернаўлавіцель пры машыне тав. Валковіча. За 3 гадзіны работы машыніста ў зернаўлавіцелі назбіралася больш 700 грамаў збожжа. Вакол гэтага факта былі мабілізаваны мясцовы калгаснікаў.

У гэтым годзе непараўнальна лепш праводзіцца малацьба. Палітаддзел і дырэкцыя МТС сістэматычна правяраюць работу малатарань. Тут была звернута асаблівая ўвага на тое, каб вымалачваўся ўвесь хлеб, каб не было страт, каб мякіціліся сабраныя каласы. З першых-жа дзён быў арганізован улік збожжа. Прама з малатарні хлеб адпраўляўся на дзяржаўныя загатоўчыя пункты ў лік хлебапаставак і на выдачу авансаў калгаснікам.

Шырокае растлумачэнне пастаноў апошніх пленумаў ЦК ВКП(б) і КП(б)Б мабілізавала калгасную грамадскасць на своечасовае, добраякаснае і датэрміновае выкананне хлебапаставак і натураплаты МТС. Матэрыялы пленума ЦК палітаддзел выдаў асобнай брашурай і распаў сюдзіў сярод калгаснікаў. Брашура прапрацоўвалася ў брыгадах, Калгасы МТС, на аснове разгортвання масавай работы, соцспаборніцтва і ударніцтва паміж калгасамі і ўнутры калгасаў датэрмінова выканалі план хлебапаставак і натураплаты за работу МТС.

Нашы калгасы арганізаванымі гаспадарча, безумоўна, за гэты год яшчэ больш вырасліі, з кожным днём большэвізуюцца. У гэтым годзе мы заваявалі больш высокі ўраджай збожжавых. Ураджай быў бы ў гэтым годзе таксама непараўнальна вышэй, чым у мінулым годзе. Усё гэта нам дае поўнае права сказаць, што нашы калгасы ў гэтым годзе зрабілі далейшы і буйнейшы крок да заможнага культурнага жыцця.

Аднак, дасягнутыя поспехі не даюць нам права на самаўдавальненне. Наперадзе—адказнейшая задача — уборка і здача дзяржаве бульбы, завяванне яшчэ больш высокага ўраджаю ў будучым годзе.

Зараз калгасы нашай МТС разгарнулі барацьбу за высокаякасную сяўбу азімых.

Большасць калгаснікаў зразумелі важнасць укаранення агратэхнічных правіл на калгасных палі. Глыбіня ворыва, высокая якасць насення, добрая яго заделка—за гэта змагаюцца лепшыя калгасы, лепшыя нашы калгаснікі. Наша задача — вопыт лепшых арабіць здабыткам усіх калгасаў, каб не толькі большасць, але ўсе калгасы насеялі высокаякасна і гэтым самым заваявалі высокі ўраджай будучага года.

У БАРАЦЬБЕ ЗА ПЯРШЫНСТВА Ў РАЁНЕ

Наш калгас імя 1 мая першым у Кайкаўскім сельсавеце 8 жніўня выканаў план хлебапаставак. 10 жніўня быў выкананы план натураплаты за работу МТС.

Гэтага мы дабіліся на аснове правільнай арганізацыі працы, расстаноўкі людзей на рашаючыя ўчасткі работы.

З першага дня ўборкі разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва паміж брыгадамі і звенямі на датэрміновае і высокаякаснае выкананне плана. Другая брыгада Філіча ў спаборніцтве з першай брыгадай Хмялеўскага ўзяла пяршынства.

Штодзённа была арганізавана праверка ходу соцспаборніцтва паміж брыгадамі і звенямі. У першай брыгадзе ўвесь час ішло ўперадзе звяно Хмялеўскай Волькі. Жнеі давалі замест нормы ў 0,12 гектара, 0,14 гектара. Лепшыя ўдарніцы Камлюк Паладзя і Шайкоўская Вера выжынялі штодзень па 0,17—0,18 гектара.

На гэта мы мабілізавалі ўсіх калгаснікаў, па лепшых раўнялі адстаючых. У брыгадах і звенніх была разгорнута вялікая работа па барацьбе з лодырамі і сімулянтамі. Першымі былі занесены на чорную дошку гультаі Камлюк Васіль і Камлюк Марыля. Гэтага было даволі. Праз некалькі дзён яны пачалі працаваць як і іншыя калгаснікі, штодзённа перавыконваць норму.

Такім чынам, праз соцспаборніцтва, падцягванне адстаючых абедзве брыгады правялі ўборку ў максімальна-кароткія тэрміны. За чатыры дні была праведзена ўборка жыта, а ўсіх зернавых за 10 дзён. Жняярка выжынала штодзень па 6 гектараў. На ёй працаваў наш лепшы машыніст Камлюк Алесь.

На полі мы не пакінулі ніводнага коласа. Пасля падграбання быў арганізаван ручны збор каласоў.

Паміж уборкай і малацьбой разрыву ў нас не было. Малаціць пачалі на 5-ы дзень уборкі, тут-жа на полі. Поўскладаная малатарня змалочвала 170 цэнтнераў у дзень замест нормы ў 90. Малацілі днём і ноччу.

Гэта забяспечыла поспех. Мы першымі ў раёне выканалі план хлебапаставак.

Зараз у нас па-баявому праходзіць сяўба. Ужо засеяна 40 гектараў пры плане ў 70. Сяўба праходзіць на добра падрыхтаванай глебе. Перад пасевам праведзена другое ворыва глыбінёй 16-18 см. Асаблівая ўвага звернута на якасць. Па прапанове брыгадзіра Хмялеўскага Міколы (яго брыгада ідзе ўперадзе па сяўбе) змагаемся за 17 цэнтнераў зернавых з гектара.

У гэтым годзе ўраджай у нас мала чаго меншы. Жыта і ячменю мы атрымалі па 16-14 цэнтн. з гектара.

Непараўнана ўзрасла вага працадня калгасніка. У гэтым годзе мы атрымаем на працадзень па 6 кгр. зернавых і па 15-16 кгр. бульбы.

Большасць нашых калгаснікаў пачынае жыць заможна.

Мы не замкнуліся ў рамкі свайго калгаса. У час малацьбы была арганізавана дапамога аднаасобнаму сектару.

Штодзённая сувязь і дапамога аднаасобнікам дала свае рэзультаты. За апошнія дні мы прынялі ў калгас трох новых аднаасобнікаў. 24 жніўня падалі заявы яшчэ 5 гаспадарак.

Лічым, што ў бліжэйшыя дні ўсе 15 астаўшыхся аднаасобнікаў уступяць у калгас.

АЎРУСЕНЯ—старшыня калгаса імя 1 МАЯ, Кайкаўскага сельсавета, Менскага раёна.

Мы ўступаем у калгас

(Адказ аднаасобнікаў вёскі Астравы, Кайкаўскага сельсавета, Менскага раёна на адкрытае пісьмо аднаасобнікаў вёскі Шугайлава, Аршанскага раёна).

Днямі мы прапрацавалі ваша пісьмо. Мы ўбачылі шчырую праўду вашых слоў. Тады мы ганарыліся вашымі поспехамі і больш напружвалі сілы, каб справай адказаць на ваша пісьмо.

І сёння мы таксама разам з усімі калгаснікамі і аднаасобнікамі нашага раёна дзелім вялікую радасць на 6 кгр. зернавых і па 16 кгр. бульбы. Гэта небывалае багацце.

А мы вось гэтым пахваліцца не можам. Яшчэ добра будзе, калі наш «працадзень» аплоціцца па кілограму зернавых, а то і менш.

Таму адказ на ваша пісьмо мы раз[illegible] падаць заявы ў калгас, каб разам працаваць і жыць заможна. Апрача гэтага, кожны з нас абавязваецца ўцягнуць у калгас па дзве-тры гаспадаркі.

Аднаасобнікі вёскі Астравы, уступіўшыя ў калгас:

ХМЯЛЕЎСКАЯ МАРЫЛЯ, КЛАЧКО ВАСІЛЬ, ФІЛІЧ ІВАН, ХМЯЛЕЎСКІ ВАСІЛЬ, ХАРЭЎСКІ ВЛАДЗІМЕР, ФІЛІЧ ЗАХАР, ФІЛІЧ ЯЗЭП, ФІЛІЧ ЕЛІЗАВЕТА.

Група аднаасобнікаў вёскі Астравы, уступіўшых у калгас.

Будзь нашай перамогі. Сёння адзначаем дзень поўным выкананнем плана хлебапаставак дзяржаве.

Мы жывем побач з калгасам імя 1 мая. На палях калгаса штодзённа наглядалі сапраўды гаспадарчыя адносіны да ўраджаю, бачылі, як калгаснікі аддана змагаюцца за першую запавецдзь—выкананне плана хлебапаставак. Калгас за 10 дзён высокаякасна ўбраў ураджай.

А вось мы ад калгаса ўсё-ж адсталі. На 2 тыдні ў нас зацягнулася ўборка. Тады мы яшчэ раз бачылі моц калектыўнай працы, поспехі.

Пачалася малацьба. Калгас паспяхова праводзіў абмалот і не забываў на нас. Сваімі сіламі ён арганізаваў нам малацьбу па дзесяцідворках. Дзякуючы гэтаму мы ўслед за калгасам выканалі план хлебапаставак.

Гэтым мы бліжэй сталі да калгаса. І была вялікая радасць для нас, радасць за нашу будучыню, калі на справе ўбачылі якой цаной аплачваецца працадзень калгасніка.

Днямі нашы суседзі ў калгасе атрымалі на працадзень адных толькі авансаў па аднаму кілограму збожжа. І ўсяго яны атрымліваюць за працадзень по

З ПРАРЫЎНЫХ—У ПЕРАДАВЫЯ

У сельсавеце яшчэ 50 проц. аднаасобнікаў. Увесь сельсавет раскінут па хутарах. Гэта, безумоўна, ускладняе работу сельсавета па выкананню дзяржаўных абавязкаў, у прыватнасці хлебапаставак.

Па сутнасці кажучы, падрыхтоўку да хлебаздачы мы пачалі з веснавой пасеўнай кампаніі. Мы не абмежаліся дзяўдзеннем планаў пасеву, але правяралі як хто выконвае даведзены яму план. Добрыя вынікі веснавой пасеўнай кампаніі пераканалі нас у тым, што мы ў гэтым годзе маем усе ўмовы і павінны дабіцца пяршынства ў раёне.

Пад гэтым лозунгам мы праводзілі ўсю падрыхтоўчую работу да ўборачнай і саму ўборку. Асноўнае, на што мы звярнулі асаблівую ўвагу — гэта тыя гаспадаркі, якія ў мінулым годзе ўхіляліся ад выканання сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай. Кожны член сельсавета, кожны дзесяцідворнік меў у сябе прозвішчы тых аднаасобнікаў, якія ў мінулыя гады ўхіляліся ад выканання дзяржаўных паставак. У выніку цэлы рад гаспадарак, якія ў мінулым годзе зацягвалі або ўсім не выконвалі сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай (Сазіцкі Ісак, Адамовіч Тэкля, Каутун Васіль і іншыя) у гэтым годзе адлымі з першых выканалі свой план хлебапаставак.

Узаемадапамога калгаса і аднаасобнікаў, сумесная работа на малацьбе сталі асноўным метадам работы працоўных аднаасобнікаў. У

адносінах да калгасаў рашаючую ролю адыгралі тыя новыя адносіны калгаснікаў да калгаснай вытворчасці, якія мы з асаблівай сілай наглядалі ў гэтым годзе. Нярэдка брыгадзіры і актывісты таго ці іншага калгаса прыходзілі ў сельсавет даведацца аб становішчы выканання планаў у другім спаборнічаючым з ім калгасе, каб ніяк не здаць пяршынства на датэрміновае выкананне плана. Нашы калгасы па сёнешні дзень не толькі выканалі план абавязковых паставак дзяржаве, але і поўнасцю разлічыцца за работу МТС. Папярэдняя разлікі па размеркаванню ўраджаю паказваюць вялікае павелічэнне вагі працадня ў гэтым годзе. У калгасе імя Леніна і іншых вага працадня ўзнімаецца не менш, чым на 50 проц. Такім чынам мы можам з усёй адказнасцю заявіць, што ў гэтым годзе зроблен значны крок наперад на шляху ператварэння ўсіх нашых калгасаў у большэвіцкія і ўсіх калгаснікаў у заможных.

Безумоўна, у нашай рабоце ёсць яшчэ шмат прарываў. Першым і галоўным нашым недахопам мы лічым тое, што не здолелі спалучыць барацьбу за датэрміновае выкананне планаў хлебапаставак з арганізацыяй новага прыліву. Толькі ў асобных калгасах, напр. у калгасе імя Леніна, намецілася некаторы зрух у гэтай справе. Тут нам прыдзецца неадкладна выправіць гэту памылку і ўзяцца за арганізацыю прыліву. Мы павінны скарыстаць добрыя вынікі сельска-гаспадарчага года нашых калгасаў, каб на канкрэтных прыкладах паказаць працоўным аднаасобнікам перавагу калгаснай гаспадаркі. Хоць план хлебапаставак па аднаасобнаму сектару мы выканалі, але у нас яшчэ ёсць 5 аднаасобнікаў, якія не выканалі поўнасцю свайго плана. Да гэтых злосных сабатажнікаў мы павінны неадкладна прымяніць законы совецкай улады, з тым, каб кожны калгаснік і сумленны аднаасобнік бачылі, што зрываць дзяржаўныя планы нікому мы не дамо.

Старшыня Каподзішчанскага сельсавета ШЫРКО.

Як мы забяспечылі поспех

Наша брыгада першай у сельсавеце і другой у раёне пачала здачу новага ўраджаю дзяржаве па плану хлебапаставак. 16 жніўня мы адвезлі на прыёмачны пункт першыя два цэнтнеры. Праз 15 дзён план хлебапаставак выканалі поўнасцю.

Як быў забяспечан гэты поспех?

Ураджай у нашай брыгадзе і ва ўсім калгасе ў гэтым годзе небывала высокі. Мы паставілі задачу — па-сапраўднаму арганізаваць уборку ў максімальна-скарочаныя тэрміны, не дапусціць страт. У звеннях была ўведзена індывідуальная здельшчына. Яна паказала нам лепшых ударнікаў, дала высокую якасць работы. Звяно Жаркевіч Юльлі, якое з першых дзён працавала на аснове індывідуальнай здельшчыны, выжынала замест нормы 0,11 гектара—0,17—0,18 гектара. Звяно Ламакі Ліды ў першы дзень працавала групай. Але на другі дзень яны ўбачылі невыгаднасць гэтага. Два дні работы па гэтаму метаду яны лёдзь-ледзь выконвалі норму. Пасля ўсе перайшлі на індывідуальную работу.

Поспехі ўборачнай былі забяспечаны. Жнейка працавала бесперабойна, зжынаючы ў дзень па 5—5,5 гектара. Вялікую ролю ў час уборкі адыграла каса.

У выніку гэтага ўборка азімых была закончана за 4,5 дні, а ўсіх зернавых—за 10 дзён. У брыгадзе быў арганізован збор каласоў. Змагаючыся за кожны колас, за кожнае каліва зярна, дзеці сабралі больш 14 цэнтнераў.

Разам з уборкай праходзіла малацьба. Малацілі і ноччу. Была прыстасавана да трактара прыгадная малатарня. Яна намалачвала ў суткі 40 цэнтнераў.

Брыгада на малацьбе змагалася за якасць, супроць малейшых страт. У саломе не было пакінута ніводнага зярна. Соцыялістычныя адносіны да працы далі добрыя рэзультаты ў малацьбе і забяспечылі выкананне плана хлебапаставак у тэрмін.

З-пад малатарні прама на прыёмачны пункт была арганізавана адпраўка збожжа. У паспяховым правядзенні малацьбы і хлебапаставак вялікую ролю адыграла авансаванне калгаснікаў. На працадзень выдача авансам адзін кілограм зернавых.

Мяркуем, што на працадзень прыпадзе не менш 5 кгр. зернавых і 12 кгр. бульбы.

Высокі працадзень узнімае актыўнасць калгаснікаў. У час сяўбы брыгады і яшчэ большай упартасцю змагаюцца за якасць, за яшчэ большы ўраджай будучага года.

ЯЗЭП КАЗАК—брыгадзір 3-й брыгады калгаса імя 1-ай КОННАЙ, Новадворскага сельсавета.

Аршанскі раён рыхтуецца да з'езда рабселькораў

Аршанскі райком КП(б)Б і палітаддзел МТС вынеслі пастанову аб падрыхтоўцы да Усебеларускага з'езда рабселькораў.

У сваёй пастанове РК КП(б)Б і палітаддзел МТС абавязалі ўсіх сакратароў партыкомаў, партарганізатараў прадпрыемстваў, саўгасаў і калгасаў прапрацаваць на чарговым партдні пастанову ЦК КП(б)Б аб Усебеларускім з'ездзе рабселькораў і пісьмо рэдактараў цэхавых і брыгадных газет завода імя ВАРАШЫЛАВА. Пісьмо перадрукавана ў раённай газеце «ЛЕНІНСКІ ПРЫЗЫЎ».

На аснове рашэння ЦК і пісьма завода імя Варашылава, РК КП(б)Б і палітаддзел абавязалі распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па падрыхтоўцы да злёта, узмацнення кіраўніцтва рабселькораўскім рухам.

Усім партарганізацыям і парторгам прапанавана арганізаваць масавую работу вокал аб'яўленага «Звяздой» МЕСЯЧНІКА АБМЕНУ ВОПЫТАМ РАБОТЫ НІЗАВОГА ДРУКУ.

Уся работа разгортваецца пад кутом гледжання барацьбы за выкананне промфінплана, вуплдзення тэхнікай, лепшай падрыхтоўкі да зімы, паляпшэння работы транспарта і завяршэння да 15 верасня апрацоўкі і здачы дзяржаве ільнапрадукцыі.

Такім чынам падрыхтоўка да з'езда ў раёне цесна звязана з выкананнем усіх гаспадарча-палітычных задач.

Следам за Аршанскім раёнам у падрыхтоўку да злёта павінны ўключыцца ўсе раённыя партыйныя арганізацыі, палітаддзелы і раённыя газеты ўсёй Беларусі.

За рубяжом

Агіднасці япона-манчжурскай паліцыі

ХАБАРАЎСК, 26 жніўня. (БЕЛТА) Згодна апошніх паведамленняў, усяго на КУЧ арыштаваны, пачынаючы з 13-га жніўня, 54 служачыя—совецкія грамадзяне. У той час, як першапачаткова арышты рабіліся паліцэйскімі Манчжурыі і белагвардзейцамі, апошнія арышты праводзяцца ўжо адкрыта японскай жандармерыяй.

Сваякі арыштаваных вельмі ўстрывожаны паведамленнямі аб гвалтах і бесчалавечных катаваннях, якім падпадаюць арыштаваны ў паліцэйскіх засценках, з боку паліцэйскіх белагвардзейцаў і манчжур, а таксама з боку японскіх жандармаў.

Асабліва, як заўсёды, стараюцца белагвардзейцы. Найбольш пашыраны збіванне арыштаваных палкамі. Прымяняюцца, аднак, і больш утончаныя катаванні. У некаторых выпадках сем'і арыштаваных адтрымліваюць іх акрываўленую бялізну.

Усе гэтыя метады «ўдзеяння» прымяняюцца з мэтай вырваць ад арыштаваных «прызнанне» і «раскаянне» ў тым, нібыта яны займаліся шкодніцкай і тэрарыстычнай дзейнасцю на Усходняй лініі КУЧ. Ад збіваемых і катуемых арыштаваных трабуюць падпісання пратаколаў, якія змяшчаюць «прызнанне», быццам яны, па загаду штаба ОКДВА, падтрымлівалі сувязь з хунхузамі і арганізоўвалі праз іх замахі на паязды, станцыі і т. д. і т. п.

Япона-манчжурскія газеты патрабуюць далейшых арыштаў совецкіх служачых КУЧ.

ХАБАРАЎСК, 25 жніўня (БЕЛТА). Інспіруемыя японскімі ваеннымі коламі харбінскія газеты прадаўжаюць весці антысовецкую кампанію, патрабуючы далейшых арыштаў совецкіх служачых КУЧ. Пры гэтым высоўваецца патрабаванне не абмяжоўвацца арыштамі сярэдняга персанала, а арыштоўваць вышэйшых кіраўнікоў дарогі. У прыватнасці, «Харбинское время» высоўвае правакацыйныя абвінавачанні супроць начальніка службы эксплаатацыі совецкага грамадзяніна Іванова і яго памочніка Зотава, абвінавачваючы іх у пакрыванні «шкодніцтва».

Японская газета «Харбін-ніц-жніці» ад 24 жніўня, паведамляючы аб правядзімых арыштах совецкіх грамадзян, піша: «У далейшым паліцыяй будуць арыштаваны вышэйшыя агенты КУЧ. Магчыма, што хваля арыштаў з Усходняй лініі перакоціцца ў горад Харбін, дзе будуць праведзены масавыя арышты».

У АБАРОНУ СССР

Магутная дэманстрацыя парыжскага пролетарыята

ПАРЫЖ, 26 жніўня. (БЕЛТА). Мітынг адзінства дзесяняў, арганізаваны социялістычнай і комуністычнай партыямі, выліўся ў магутную дэманстрацыю парыжскага пролетарыята. На мітынгу прысутнічала 10 тысяч працоўных. Сход адкрыўся пад спяванне «Інтэрнацыянала».

Сакратар социялістычнай федэрацыі департамента Сены заклікаў да абароны СССР.

Бурныя апладысменты было спатканы выступленне комуністычнага дэпутата Рэнетта, указаўшага, што лозунг «Советы ўсюды» становіцца баявым лозунгам міжнароднага рабочага класа. Член ЦК компартыі Францыі Даюкло выкрыў вымыслы і паклёпніцкія выдумкі, накіраваныя супроць СССР, і падкрэсліў пастомную барацьбу СССР за мір.

Мітынг аднагалосна прыняў рэзалюцыю, у якой падкрэсліваецца воля працоўных Францыі абараняць адзіным фронтам СССР — бацькаўшчыну працоўных усяго света.

* * *

У Мюльгаўзене ажыццёўлена адзінства дзесяняў сярод будаўнічых рабочых. Прадпрымецы ўзмацняюць наступленне на зарплату рабочых. Тэкстыльныя прамысловцы дэпартамента абмялі аб зніжэнні зарплаты на 10 проц. Гэта выклікала вялікае абурэнне рабочых. Для барацьбы супроць зніжэння зарплаты выбран адзіны профкамітэт.

Турэцкая ваенная дэлегацыя прыбыла ў Маскву

МАСКВА, 27 жніўня. (БЕЛТА). 27 жніўня ў Маскву прыбыла адэскім хуткім поездам турэцкая ваенная дэлегацыя, ў складзе 12 чыноў турэцкай арміі на чале з генералам Фахрэтын-пашай.

ПРЫЁМ ТУРЭЦКАЙ ВАЕННАЙ ДЭЛЕГАЦЫІ т. К. Е. ВАРАШЫЛАВЫМ

У той-жа дзень народны камісар абароны т. К. Е. Варашылаў прыняў генерала Фахрэтын-пашу, генерала Музафер-пашу і палкоўніка Нуры-бея, якіх суправаджаў в. аб. турэцкага ваеннага аташэ капітан Энвер-бей.

СУВЯЗЬ ПАМІЖ ТОКІО І БЕРЛІНАМ

БРУСЕЛЬ, 26 жніўня. (Інфармацыя «Правды»). Каментуючы агрэсіўную палітыку Японіі на Далёкім Усходзе, бельгійская «Пепль» пішна:

«Акупацыя Манчжурыі стварыла на Далёкім Усходзе няўстойлівае становішча. Ніхто ім нездаволен. Усе шукаюць з яго выхаду. Нельга не звязаць аднаўлення японскай пагрозы з тоўпаснямі, ствараемымі Германіяй і Польшчай, заключэнню Усходняга гарантыйнага пакта».

Нагадваючы аб захватніцкіх планах Германіі на Усходняй Еўропе, газета заключае: «Пагадненне паміж нацыянал-социялістскай Германіяй і Японіяй з'яўляецца фактам».

* * *

МУРМАНСК, 27 жніўня (БЕЛТА). Сёння ў 6 гадзін вечара ў Мурманск прыбылі совецкія парусныя яхты «Ударнік» і «Піонер», якія зрабілі паход вакол Скандынаўскага паўострава. У парту яхты былі спатканы шматлікімі дэлегацыямі маракоў тралавага флота, рабочых суднарамонтнага завода і рыбаапрацоўчай прамысловасці.

Першы ўсесаюзны з'езд совецкіх пісьменнікаў

РЭЗАЛЮЦЫЯ ПЕРШАГА УСЕСАЮЗНАГА З'ЕЗДА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ ПА ДАКЛАДУ тав. РАДЭКА АБ МІЖНАРОДНАЙ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Першы ўсесаюзны з'езд совецкіх пісьменнікаў, заслухаўшы даклад тав. Радэка аб міжнароднай мастацкай літаратуры і абмен думкамі па дакладу, устанаўляе, што, не гледзячы на жорсткія рэпрэсіі, якія абрушваюцца на рабочы клас і працоўную інтэлігенцыю зарубежных краін з боку пануючага капіталістычнага класа, не гледзячы на разгул фашызма і крывавай рэакцыі, не гледзячы на тое, што рад лепшых прадстаўнікоў рэволюцыйнай літаратуры пакутуюць у фашысцкіх засценках, падпадаючы прамому фізічнаму знішчэнню,—сілы рэволюцыйнай літаратуры растуць таксама, як і сілы рабочага класа, і яе баявы голас раздаецца ўсё гучней, падымаючы прыгнечаныя масы на барацьбу супроць капіталістычнага рабства.

З'езд совецкіх пісьменнікаў заклікае сваіх братоў, рэволюцыйных пісьменнікаў усяго свету, усёй сілай мастацкага слова змагаецца супроць капіталістычнага прыгнечання, фашысцкага варварства, каланіяльнага рабства, супроць падрыхтоўкі новых імперыялістычных войн, за вбарону СССР—бацькаўшчыны працоўчага чалавецтва.

На прыкладзе нашых пісьменнікаў, прайшоўшых слаўны шлях з часу, калі невялікая група пісьменнікаў на чале з Горкім пашла за партыяй Леніна, і да сучаснага перыяда, калі ў рэзультаце перамогі социялізма ў СССР совецкая літаратура ператварылася ў велізарную культурную сілу, стала літаратурай усіх народаў, якая выражае ў сваёй творчасці вялікую работу працоўных мас Совецкага Саюза па стварэнню новага социялістычнага ладу, лепшыя прадстаўнікі зарубежнай літаратуры пераконваюцца ў тым, што сапраўдны росквіт літаратуры і мастацтва магчымы толькі ва ўмовах перамогі социялізма.

У СССР ідзе вялікі рост культуры і творчасці народных мас. У краінах капіталізма—эканамічны хаос, распад культуры, заняпад навукі, разлажэнне літаратуры пануючых класаў. І сапраўдныя творы мастацтва ствараюць толькі тыя мастакі слова, якія падымаюць голас пратэсту супроць яўнаў капіталізма, супроць вострых супярэчнасцей капіталістычнага грамадства.

Першы з'езд совецкіх пісьменнікаў горача вітае прысутных на з'ездзе пісьменнікаў Францыі, Англіі, ЗША, Кітая, Германіі, Турцыі, Чэха-Славакіі, Іспаніі, Нарвегіі, Данніі, Грэцыі і Галандыі, якія адгукнуліся на запрашэнне аб паездцы ў СССР і прынялі жывейшы ўдзел у рабоце з'езда.

З'езд глыбока цэніць сімпатыі да СССР і социялістычнага будаўніцтва, да новай культуры, якая ствараецца народамі СССР, праяўленыя выступаўшымі на з'ездзе замежнымі пісьменнікамі тт. МАРТЫН АНДЭРСЕН НЕКСЕ, МАЛЬРО, ЖАН РЫШАР БЛОК, ЯКУБ КАДРЫ, БРЭДЗЛЬ, ПЛІВ'Е, ХУ-ЛАНЬЧЫ, АРАГОНАМ, БЕХЕРАМ, АННАЙ БЕЛЬ ЗЛІС.

З'езд шле сваё брацкае прывітанне РОМЭН РАЛАНУ, АНДРЭ ЖЫДУ, АНРЫ БАРБЮСУ, БЕРНАРДУ ШОУ, ТЭОДАРУ ДРАЙЗЕРУ, ЭПТОНУ СІНКЛЕРУ, ГЕНРЫХУ МАНУ і ЛУ-СІНЮ, якія мужна выконваюць свой благародны доўг лепшых прыяцеляў працоўнага чалавецтва.

З'езд пісьменнікаў выказвае сваю глыбокую салідарнасць з рэволюцыйнымі пісьменнікамі — палоннікамі міжнароднай рэакцыі, абараняючымі справу працоўных мас, справу прагрэсу чалавецтва, і абяцае ўсімі сіламі змагацца за іх вызваленне.

З'езд цвёрда пераконан, што міжнародная рэволюцыйная літаратура належыць будучае, бо яна звязана з барацьбой рабочага класа за вызваленне ўсяго чалавецтва (БЕЛТА).

ДЗЕННІК З'ЕЗДА

26 жніўня на ранішнім пасяджэнні—спрэчкі па дакладу тав. К. Радэка аб сучаснай сусветнай літаратуры і задачах пролетарскага мастацтва. Старшынствуе т. Бела Ілеш.

Першым у спрэчках выступае латышскі рэволюцыйны пісьменнік т. Лінард Лайцэн. Ён спыняецца на пытанні аб скарыстанні фальклора ў літаратуры.

Апладысментамі сустракае з'езд наступнага аратара—нямецкага пролетарскага пісьменніка Херцфельдэ. Ён прысвячае сваю прамову своеасаблівому герою сучаснай буржуазнай літаратуры—Джэмсу Джойсу, яго светапогляду, яго творчаму метаду.

Доўгімі апладысментамі сустракаюць дэлегаты з'езда з'яўленне на трыбуне вядомага германскага рэволюцыйнага пісьменніка Іоганеса Бехера.

Спатканы доўгімі апладысментамі, на трыбуне з'яўляецца нямецкі пісьменнік Тэодар Плів'е.

Горача сустракае з'езд выступленне т. Ламінцава, які ад імя дэлегацыі тульскіх рабочых перадае сардэчнае рабочае прывітанне ад пролетараў Тулы.

Пад шумныя апладысменты дэлегацыя тулякоў уручае членам прэзідыума падарункі для перадачы А. М. Горкаму—стрэльбу, самавар і чайнік.

Доўга не змаўкаюць у Калонным зале апладысменты, калі на трыбуне з'яўляецца кітайскі пролетарскі пісьменнік т. Змі-Сяо. Ад імя Лігі рэволюцыйных пісьменнікаў Кітая ён перадае з'езду палкае брацкае прывітанне.

Пасля перапынку дэлегацыя ленінградскага турбіннага завода імя Сталіна перадае з'езду пролетарскае прывітанне 8-тысячнага калектыва завода.

Апладысментамі сустракае зала паведамленне дэлегацыі аб новай перамозе сталінцаў—магутнай турбіне ў 100 тыс. клвт. уласнай канструкцыі завода.

У канцы ранішняга пасяджэння выступіў з заключным словам тав. Карл Радэк, спатканы апладысментамі. Дасціпная прамова т. Радэка не раз перарывалася апладысментамі і адабраючым смехам.

Тав. Джавахашвілі ад імя дэлегацый узбекскай, туркменскай, таджыкскай, азэрбайджанскай, армянскай, грузінскай, беларускай і украінскай прапануе праект рэзалюцыі з'езда па дакладу т. Радэка аб міжнародным мастацкай літаратуры.

Рэзалюцыя прымаецца аднагалосна.

АДКРЫЦЦЁ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ Ў КАЛГАСЕ

БАРЫСАЎ. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

25 жніўня ў калгасе «Чырвоная зорка» адбылося вялікае свята. Перадавы ў раёне калгас, паспяхова і своечасова закончыўшы веснавую сяўбу і дасягнуўшы добрай ураджайнасці, зараз паспяхова закончыў уборку збожжа і здачу ўсіх дзяржаўных паставак.

Як завяршэнне гэтай вялікай перамогі, сілами калгаснікаў пры дапамозе шэфаў і рабочых ТЭЦ імя Леніна ў калгасе ўрачыста была пушчана электрастанцыя.

У першы вечар ў 12 кватэрах лепшых калгаснікаў і ва ўсіх будынках калгаса гарэлі лямпачкі Ільича.

На ўрачыстасці прысутнічалі і выступілі з прывітаннямі сакратар РК КП(б)Б т. Чарнышоў, старшыня РВК т. Баранчык, рабочыя-шэфы, прадстаўнікі лепшых суседніх калгасаў «Маяк социялізма», імя Варашылава, імя Якаўлева і ад соўгаса Весялова. У часе ўрачыстасцей атрымана прывітальная тэлеграма ад старшыні ЦВК БССР тав. Чарвякова. Адказваючы на тэлеграму, калгаснікі абавяваліся, разгарнуўшы метады социялістычнай працы, закончыць да 1 верасня пасеў азімых, падняць пад зяб усю плошчу да 1 кастрычніка, здаць ільнавалакно і пяньку не пазней 25 кастрычніка. Калгаснікі абяцалі Окцябрскія святы сустрэць лямпачкай Ільича ў кожнай калгаснай хаце і поўным выкананнем усіх работ.

У заключэнне былі прэміраваны лепшыя брыгадзіры і калгаснікі. Пасля ўрачыстай часткі адбылася багатая калгасная вячэра.

СЯРГЕЙ ЗНАЁМЫ.

УСОЎНАРКОМЕ БССР

25 ЖНІЎНЯ АДБЫЛОСЯ ПАСЯДЖЭННЕ СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР.

СНК заслухаў даклады дырэктара свінасоўгаса «Зара захада» тав. Ланкевіча і дырэктара Менскага свінаводтрэста тав. Смірнова.

Для аказання дапамогі і наладжання работы ў соўгасе «Негарэлае» Соўнарком пастанавіў накіраваць у гэты соўгас двух вопытных работнікаў па свінагадоўлі.

* * *

Соўнарком вылучыў камісію, якой даручыў распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па арганізацыі новых рамонтных майстэрань у гарадах і раёнах, перыядычныя праверкі вагавога інвентара і ўдакладнення функцый упраўлення мер і вагі.

* * *

Крычаўскі фасфарытны завод дасягнуў поўнай сваёй магутнасці і можа выпрацаваць 32.500 тон фасфарытаў у год. Аднак, завод вытворчай праграмы не выконвае. Вялікую перашкоду для выканання вытворчага плана стварае водны транспарт, які зрывае дастаўку руды.

Соўнарком прыняў да ведама заяву прадстаўніка Ўпаўнаркомводтранспарта тав. Олькеса аб тым, што яны ў далейшым абавязваюцца вывезці ўсю патрэбную руду. Таксама ўзята хадайніцтва перад НКцяжпромам аб перадачы заводу рудніковай гаспадаркі.

* * *

Ураджай гэтага года па БССР значна вышэй мінулага. Але БССР па вышыні ўраджаю яшчэ адстае ад раду другіх рэспублік і абласцей, а таксама і ад Заходняй вобласці, з якою яна спаборнічае.

Соўнарком абавязаў наркамснаб дзелы, міжрайкамісіі па ўраджайнасці фарсіраваць тэмпы ўліку ўраджаю на аснове кантрольнага абмалоту з тым, каб гэта работа была закончана не пазней 15 верасня, а таксама даручыў Наркамзему і РВК арганізаваць вывучэнне і збор матэрыялаў аб лепшых і горшых па ўраджайнасці калгасах.

* * *

План фінансавання капіталаўкладанняў па рэспубліканскай прамысловасці БССР асвоен толькі на 73,7 проц., па сістэме кааперацыі—58,1 проц., па жыллёва-комунальнаму і культбытавому—66,1 проц. Зусім не выконваецца план капіталаўкладання па шырспажыву.

Соўнарком абавязаў наркамснаб тав. Гурэвіча, упаўнаркамцяжпрома тав. Свірыдава і леспрома тав. Розіна ў дэкадны тэрмін аформіць асваенне дадатковых капіталаўкладанняў і абавязаў банкі ўзмацніць кантроль над ходам будаўніцтва, сурова прытрымліваючыся ўстаноўленых фондаў. (БЕЛТА).

НАПЯРЭДАДНІ XX ГАДАВІНЫ МІЖНАРОДНАГА ЮНАЦКАГА ДНЯ

Заводскія канферэнцыі па культурна-бытавой рабоце праведзены на наступных фабрыках, заводах і прадпрыемствах Менска: «Комунар», «Комунарка», «Усход», «Окцябр» і друкарня імя Сталіна.

1 верасня ў Менску пачнецца ўсесаюзны розыгрыш промкааперацыі па ручных іграх (баскетбол, валейбол). Адкрыццё розыгрышу прыстасавана к Міжнароднаму Юнацкаму Дню і адбудзецца на Ўсебеларускім стадыёне.

У розыгрышы прымуць удзел Масква, Ленінград, Харкаў, Днепрапетроўск, Одэса, Іванава, Сталінград, Менск, Башкірыя і Крым.

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ЦЭНТРАЛЬНАГА СОВЕТА ПРОФСАЮЗАЎ БЕЛАРУСІ АД 25 ЖНІЎНЯ 1934 г.

У сувязі з хадайніцтвам нізавых комсамольскіх, партыйных і профсаюзных арганізацый, прадпрыемстваў гг. Менска і Віцебска аб даданні ім выходны дзень 30 жніўня перанесці на 1-е верасня з мэтай лепшай арганізацыі святкавання XX МЮД—дазволіць менскім і віцебскім арганізацыям перанесці выходны дзень з 30 жніўня на 1 верасня па ўсіх прадпрыемствах і установах г. Менска і Віцебска.

Абавязаць усіх дырэктароў прадпрыемстваў, кіраўнікоў устаноў і старшынь фабзаўмясцкомаў першы выходны дзень пасля 1 верасня праводзіць па ўстаноўленаму графіку выходных дзён.

ДА ЎСІХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ — ШЭФАЎ ФІНАНСАВА-КРЭДЫТНЫХ УСТАНОЎ БССР

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Калектыў рабочых чырвонасцяжнага машынабудаўнічага завода імя Варашылава з'яўляецца шэфам Наркамфіна БССР.

Рэалізуючы гэта шэфства, мы вылучылі ў апарат Наркамфіна БССР лучшых ударнікаў 10 соцз радоў лепшых ударнікаў 10 соцсумяшчальнікаў, якія прымаюць актыўны ўдзел у перабудове работы апарата. Соцнамеснік—пры Наркоме фінансаў т. МАТУСЕВІЧ, пры начальніку бюджэтнага кіраўніцтва начальніку бюджэтнага кіраўніцтва тав. ПІНСКІ, пры начальніку кіраўніцтва дзяржкрадыту і ашчадкасамі тав. ЛАНДЭ—максімум увагі адводзяць рабоце Наркамфіна.

Наш завод трымае ШТОДЗЕННУЮ сувязь з апаратам НАРКАМФІНА і кіраўніцтвам ашчадкасамі і дзяржкрадыту. На агульных цэхавых сходах работнікі Наркамфіна інфармуюць рабочых аб выкананні фінплана і задачах, якія стаяць перад фінансавай сістэмай.

Рабочымі брыгадамі завода разам з работнікамі Наркамфіна перыядычна праводзіцца па гораду праверка правільнасці выкарыстання адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў, фондаў зарплаты і т. д.

Аднак, у рабоце фінансава-крэдытных органаў яшчэ ёсць рад сур'ёзных недахопаў. Асноўным недахопам з'яўляецца слабае разгортванне арганізацыйна-масавай работы вакол выканання фінплана, у выніку чаго НЕ ВЫКАНАН ФІНПЛАН ДРУГОГА КВАРТАЛА І ПАД ПАГРОЗАЙ НЕ ВЫКАНАННЯ ПЛАН ТРЭЦЯГА КВАРТАЛА. Ёсць нямала выпадкаў парушэння палітыкі цэн.

У гэтых буйных недахопах у значнай меры вінаваты МЫ, ШЭФЫ. Для таго каб забяспечыць выкананне фінплана трэцяга квартала і сапраўдную перабудову работы фінансавага апарата, мы бярэм на сябе наступныя абавязацельствы:

1. У парадку паходу за высокую якасць фінансавай работы, абвешчаным ЦК КП(б)Б, дабіцца права рапарту тав. МОЛАТАВУ аб стопроцантным выкананні плана трэцяга квартала ДА 20 ВЕРАСНЯ І 70 ПРОЦ. ДА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЛЁТА ЎДАРНІКАЎ ФІНФРОНТА. Для гэтага:

а) вытучаем шэсць рабочых брыгад у ГОМЕЛЬ, БАБРУЙСК, ВІЦЕБСК і сельскія раёны для аказання практычнай дапамогі мясцовым арганізацыям;

б) 28 жніўня арганізоўваем правер ку выканання ўсіх фінансавых абавязацельстваў па прадпрыемствах г. МЕНСКА, для чаго вылучаем 50 чалавек, ставячы перад сабой задачу ператварыць сталіцу рэспублікі ў ўзорны раён па выкананню ўсіх фінансавых задач.

2. Арганізаваць у вопытным парадку масавы аднаразовы выезд рабочых у бліжэйшыя сельсоветы Менскага раёна з мэтай перадачы вопыту мясцам.

3. Прыняць актыўны ўдзел у правядзімай масавай праверцы раздачы калгаснікам аплочаных аблігацый пазыкі «Другі год другой пяцігодкі» і ў арганізацыі паступлення збору па калгасным падпісцы.

4. Яшчэ больш палепшыць работу соцнамеснікаў, выпучыўшы ў апарат Наркамфіна да канца года двух рабочых—лепшых ударнікаў фінфронта.

5. Завод ставіць сваёй задачай у мэтах прадстаўлення большых магчымасцей у асваенні тэхнікі соцнамеснікамі, вызваліць іх ад усялякіх нагрузак на заводзе, арганізаваць спецыяльны гурток па вывучэнню тэхнікі фінансавай справы.

6. Для аказання практычнай дапамогі нізавым арганізацыям у асваенні тэхнікі фінансавай работы, выяўленні недахопаў і ліквідацыі іх, арганізаваць выезды соцсумяшчальнікаў у раёны не менш як адзін раз у квартал для кожнага.

Мы, рабочыя, служачыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі завода імя Варашылава, заклікаем шэфаў фінансавага фронта, РАБОЧЫХ, КАЛГАСНІКАЎ БЕЛАРУСІ ЎКЛЮЧЫЦЦА Ў ПРАВЯДЗЕННЕ ПАХОДУ ЗА ВЫСОКУЮ ЯКАСЦЬ ФІНАНСАВАЙ РАБОТЫ І КОНКУРСУ-СПАБОРНІЦТВА СЕЛЬСОВЕТАЎ І ФІНАНСАВЫХ СЕКЦЫЙ, шырока разгарнуўшы соцспаборніцтва на лепшае выкананне абавязацельстваў.

Па даручэнню рабочых:

Сакратар парткома завода імя Варашылава ДЭЙЧ.

Старшыня заўкома ВЕРТКІН.

Соцсумяшчальнікі: МАТУСЕВІЧ, ПІНСКІ, ЛАНДО, БАРТАШЭВІЧ, ДАБРАВОЛЬСКІ, ЮРЭНОК, ТЫТЭРШТЭЙН, ГАПАНОВІЧ, АРЦІМЕНАЎ, РАТЫНЕЦ.

Аб устанаўленні цвёрдых норм і тарыфаў па добраахвотнаму страхаванню ў БССР пчол, птушак (племянных) трусоў (матак) у калгасах і першапачатковых кааператывах, авечак, коз і свіней у калгаснікаў і аднаасобных працоўных гаспадарках

Пастанова Совета Народных Камісараў БССР

У адпаведнасці з пастановай ЦВК і СНК СССР ад 27 ліпеня 1934 года «аб добраахвотным страхаванні» (З. З. СССР 1934 г. № 40, арт. 317), Совет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Устанавіць наступныя цвёрдыя грашовыя страхавыя нормы па добраахвотнаму страхаванню ў БССР:

а) у калгасах і першапачатковых кааператывах:

Пчол 40 руб. за адзін вулей.

Трусоў (матак) 20 руб. за адну штуку

Племянных птушак:

курэй 12 руб. за адну штуку,

качак 15 руб. за адну штуку,

гусей 30 руб. за адну штуку.

б) у калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў:

Авечак і коз 100 руб. за адну штуку.

Свіней 250 руб. за адну штуку.

2. Устанавіць для пералічаных у арт. 1. гэтай пастановы відаў добраахвотнага страхавання наступныя стаўкі страхавых плацяжоў (тарыфы) у рублях са 100 руб. страхавога забеспячэння:

	Па страхаванню пчол у калгасах і першапачатковых кааператывах пчол трусоў (матак) і племянных птушак.	У калгаснікаў.	У працоўных аднаасобнікаў
I група раёнаў	8 р. 80 кап.	7 руб. 00 к.	8 руб. 80 кап.
II » »	9 р. 00 кап.	7 » 20 »	9 » 44 »
III » »	10 р. 00 кап.	8 » 00 »	10 » 00 »
IV » »	11 р. 00 кап.	8 » 90 »	11 » 00 к.

Па страхаванню авечак, коз і свіней.

Устаноўленыя для абавязковага акладнога страхавання пастановай СНК БССР ад 23 ліпеня 1934 года «Аб абавязковым акладным страхаванні ў сельскіх мясцовасцях і гарадах БССР на 1935 г.». (З. З. БССР 1934 г., № 30, паст. 149) пучэйшы папярыць на добраахвотнае страхаванне.

3. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам, гарадскім і сельскім советам шырока папулярызаваць закон аб добраахвотным страхаванні сярод калгасаў, калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў.

Нам. старшыні Совета Народных Камісараў БССР М. ГАЛЕНДА.

Нам. кіраўніка справаў Совета Народных Камісараў БССР І. ПЯТРОВІЧ.

25 жніўня 1934 года г. Менск.

Адказны рэдактар Н. ЛЕНЦНЕР.

Памяшк. БДТ—1. Бел. Дзярж. Тэатр ОПЕРЫ І БАЛЕТА
Мастацкі кіраўн. засл. арт. рэспубл. Гітавец І. А.
Сёння БАЛЕТ ЧЫРВОНЫ МАК
Пачатак роўна ў 8 г. 30 м.
Білеты ў касе тэатра і раб. касе.

Гуляючы кіно-тэатр „Чырвоная Зорка". Мастацкая камедыя ПАС Г ЖУЖАНЫ На эстрадзе—гастролі ілюзіяніста ПАРЧЫНСКАГА
Гуляючы кіно-тэатр „Пролетарый" Новы гуляючы фільм «АКРАІНА» У фай.—КАНЦЭРТ.
Кіно „Інтэрнацыянал" З 25-VIII НОВАЯ ПРАГРАМА У праграме кіно-журнал САЮЗ ІНО
Кіно „СПАРТАК" Ад 28 жніўня Выдатны мастацкі фільм КНЯЖНА МЭРЫ Кіно-роман у 8 частках.

Першы Дзяржаўны Тэатр (БДТ—1) Мастацкі кір. засл. арт. рэсп. Л. М. ЛІТВІНАЎ 2 верасня 1934 г. Пачатак сезона 1934-35 г. К. Крапіва
КАНЕЦ ДРУЖБЫ драма ў 4 дзеях.
Прэміравана на конкурсе БССР
Білеты на мэтавыя спектаклі прымаюцца ў тэатры і ў раб. касе.

ДЗЯРЖЦЫРК ГЭТЫМІ ДНЯМІ ЗАКРЫВАЕЦЦА СЕЗОН
ВЫСТУПАЮЬ ШТОДЗЕННА ПРЫБЫЎШЫЯ З ЗАГРАНІЦЫ КІТАЙСКАЯ ТРУПА арыгінальнае відовішча.
Бухарская троўпа 10 КАДЫР-ГУЛЯМ 10 | 4 ТОРИЗО 4 легшыя турысты на батуце
І шмат новых нумароў Пачатак у 9 гадз. вечара.
30 жніўня ў 2 гадз. дня АПОШНІ РАНІШНІК пры ўдзеле ўсіх артыстаў кітайскай трупы, вербюдаў і папугаеў.

Беларускі дзяржаўны тэхнікум фізкультуры працягвае ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ.
Заявы з дакументамі прымаюцца да 15 верасня г. г. Студэнты забяспечваюцца інтэрнатам, сталоўкай, стыпендыяй і снабжэннем па першаму спісу. Стыпендыя выплачваецца на 1 курсе ад 60-80 р., на 2-м—ад 80—100 і на 3-м ад—100—125 і больш.
Прымаюцца асобы абодвух полаў з адукацыяй сямігодкі. Пераважнае пры паступленні карыстаюцца лепшыя фізкультурнікі-ударнікі, якія здалі першы комплекс „ГПА" і якія зд ючь комплекс „ГПА" другой ступені.
К заявам неабходна прыкласці: даведку аб сацстановішчы і паходжанні аб асвеце, аб нарадзінні, заведчаную анкету, 2 фотакарткі і аб стане здароўя.
Пры тэхнікуме ствараюцца падрыхтоўчыя курсы, на якія прымаюцца асобы, маючыя асвету не ніжэй 5 груп сямігодкі. Заявы накіроўваць г. Менск, 2-гі дом Советаў, Вышэйшаму Совету Фізкультуры, для тэхнікума фізкультуры.
Аб пачатку заняткаў будзе паведамлена асобна.
Дырэктар тэхнікума Крачкоўскі.

З 1-га верасня г. г. Наркомасветы АДКРЫВАЕ ІНТЭРНАТ для дзяцей начальнікаў палітаддзелаў МТС і соўгасаў (Пляц Волі, будынак ЦВК).
Наркомасветы.

УСІМ спажыўцам лабараторнага абсталявання і хімічных рэактываў
БАЗА „ЛАБОРРЕАКТИВ" БЕЛАПТЭКАКІРАЎНІЦТВА
(Менск, Совецкая, 71)
паведамляе ўсіх зацікаўленых арганізацый аб неабходнасці складання і падачы ЗАЯВАК-заказаў на лабараторнае абсталяванне і рэактывы на 1935 г. у квартальным разрэзе.
Апошні тэрмін падачы заявак—1 кастрычніка 1934 г.
Заяўкі-заказы павінны падавацца за подпісам кіраўніка арганізацыі.
Белаптэкакіраўніцтва.

У сувязі з рашэннем СНК СССР аб падрыхтоўцы да будаўніцтва 1935 года
Жыллёва-зямельнае кіраўніцтва Менгорсовета прапануе УСІМ АРГАНІЗАЦЫЯМ І УСТАНОВАМ г. МЕНСКА, якія ў 1935 г. будуць праводзіць капітальнае будаўніцтва,
ПАДАЦЬ СВАЕ ЗАЯЎКІ ў жыллёва-зямельнае кіраўніцтва (Пляц Волі, 2) для адводу будаўнічых участкаў.
У заяўках павінна быць указана: 1. характар будаўніцтва, 2. будаўнічы аб'ём і жадаемы участак.
Тэрмін падачы заявак да 15-IX—34 г.
Пасля гэтага тэрміну заяўкі аб адводзе участка прымацца не будуць.
Жылземкіраўніцтва Менгорсовета.

29-га жніўня рэдакцыя газеты „ЗВЯЗДА" СКЛІКАЕ нараду ПА ПЫТАННЯХ ВАПНАВАННЯ САЛОМЫ.
На нараду запрашаюцца прадстаўнікі жывёлагадоўчага кіраўніцтва Наркамзема (Стрэле, Грыневіч, Даніловіч, Каплан, Манахава), Упаўнаркомсоўгасаў (Шапавалаў), менскага Свіваводтрэста (Смірноў), менскага Малакопрамтрэста (Сцепанаў), менскага Горземанддзела (Жарын), а таксама ўсе аграномы кармавікі і зоатэхнікі жывёлагадоўчых трэстаў і горземанддзела.
Нарада адбудзецца ў 5 гадзін вечара ў памяшканні рэдакцыі (Совецкая, 63, трэці паверх, кабінет рэдактара).

Менскі дашкольны тэхнікум ПРАДАЎЖАЕ ПРЫЕМ ЗАЯЎ на АСЕННЯМУ НАБОРУ да 3-IX—34 г.
Прымаюцца асобы, скончыўшыя сямігодку або маючыя веды ў абёме сямігодкі.
Паступаючыя трымаюць іспыты па мове і літаратуры, матэматыцы, геаграфіі і гісторыі.
Да заяў патрэбна дадаць наступныя дакументы (у арыгіналах): аб адукацыі, аб сацстановішчы і сацпаходжанні, метрыку, заведчаную анкету, аб здароўі, 2 фота-карткі і паштовых марак на 40 кап.
Прынятыя забяспечваюцца інтэрнатам, сталоўкай і стыпендыяй.
Заявы накіроўваць на адрасу: Менск, Совецкая, 144, дашкольнаму тэхнікуму.
ДЫРЭКЦЫЯ.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ
У садова-гародны інстытут на факультэты: плодагародны і інжынерна-тэхналагічны прымаюцца да 25-IX 34 г.
Іспыты з 25-IX-34 г. па 30-IX-34 г.
Пачатак заняткаў з 1-X—34 г.
Адрас інстытута: Менск, Лопыцка 1-я.
Дырэктар Інстытута ЛАГУЦЕНКА.

Дзяржвыдавецтву Беларусі ПАТРЭБНЫ ВОПЫТНЫЯ КАРЭКТАРЫ.
Прымаюцца таксама практыканты на ніжэй сярэдняй адукацыі.
Зварачацца: Барысаўскі тракт, Дом друку, ДВБ, тел. 20-808.
ДВБ.

Менск, друкарня «Звязды». Выпускаючы — Р. ДОДЗІН, ст. карэктар — БЯРОЗАВІК, ст. метранпаж — ПЕРАКЛАДНЕЎ, ст. стэрэатыпер — Е. КАГАН, ст. друкар — З. РУБІН. Уп. Галоўлітбела № К—3200.